Леанід Лаўрэш

# 100 выдатных дзеячаў



# Вандалін Шукевіч

100 выдатных дзеячаў беларускай культуры

Леанід ЛАЎРЭШ

# Вандалін ШУКЕВІЧ

## Беларускі археолаг і краязнаўца

Мінск
Харвест

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*
*Заснавальнік, каардынатар і рэдактар серыі А. Я. Тарас*
*Мастацкае афармленне серыі Б. Г. Клюйка*

**Лаўрэш Л.**
Вандалін Шукевіч: Беларускі археолаг і краязнаўца / Л. Лаўрэш. — Мінск : «Харвест», 2014. — 64 с. : малюнкі. — (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»)

ISBN 978-985-18-2912-1

Вандалін Мацей Шукевіч (1852—1919) з Лідчыны — славуты беларускі археолаг, этнограф, фальклярыст і краязнаўца, чалец Віленскага таварыства сяброў навукі, член-карэспандэнт Кракаўскай Акадэміі ведаў.

**ISBN 978-985-18-2912-1**

© Л. Лаўрэш, 2014
© Вокладка, Харвест, 2014

Па-сапраўднаму, біяграфія Вандаліна Шукевіча яшчэ не напісана і гэтая кніжка, вядома, можа разглядацца толькі ў якасці падыходу да будучай біяграфіі фігуры такога маштабу, як Вандалін Шукевіч.

Некалькі дзесяцігоддзяў збіраў усю магчымую інфармацыю пра земляка вядомы лідскі краязнавец 1930-х гадоў Аляксандр Снежка. У даваеннай «Лідскай Зямлі» ён надрукаваў шэраг артыкулаў пра вучонага, паспеў апрацаваць абраную ім інфармацыю і дэпанаваць машынапіс у Народнай бібліятэкі імя Асалінскіх ва Вроцлаве.

Важнейшай падзеяй у справе вывучэння біяграфіі Шукевіча стала выданая ў 2010 г. невялікая кніга прафесара археалогіі Лодзкага ўніверсітэта, доктара Мар'яны Магдалены Бломберг.

## УВОДЗІНЫ

Знаны археолаг, этнограф і грамадскі дзеяч Вандалін Мацей Шукевіч нарадзіўся 11 снежня 1852 г. у маёнтку каля вёскі Нача на Лідчыне.

У гэты час, зусім недалёка ад Начы, у маёнтку Шаўры, яшчэ працаваў вялікі гісторык гістарычнай Літвы Тэадор Нарбут. Верагодна, само паветра гэтых мясцін — сэрца старадаўняй Літвы нарадзіла ў абодвух даследчыкаў вялікае замілаванне да гісторыі роднага краю, якое вылілася ў шматгадовую апантаную даследчыцкую працу.

* * *

Археалагічнае вывучэнне Беларусі пачалося ў 2-й палове XVIII ст.

У XIX ст. Т. Нарбут даследаваў курганы паміж Магілёвам і Рагачовам а таксама ў сваім маёнтку Шаўры Лідскага павета і вызначыў пахавальны абрад — інгумацыя на грунце пад насыпам. З. Я. Даленга-Хадакоўскі склаў 4-томны «Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў», які змяшчае дадзеныя пра некалькі тысяч археалагічных помнікаў.

З сярэдзіны XIX ст. ва ўсіх еўрапейскіх краінах з'яўляецца вялікая цікаўнасць да сваёй гісторыі, узнікаюць гістарычныя навуковыя арганізацыі, добраахвотныя таварыствы аматараў, музеі і г. д. Нашу радзіму таксама не абыходзяць бокам новыя павевы і патрошку, разам з палітычнай лібералізацыяй, якую пачынае адміністрацыя новага цара Аляксандра II, зноў, пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта, аднаўляецца справа вывучэння гісторыі нашага краю.

Асаблівая роля ў гэтым належыць славутай Віленскай Археалагічнай камісіі і Музея старажытнасці ў Вільне, якія заснаваў, а потым імі кіраваў вядомы даследчык курганоў на Міншчыне Яўстах Тышкевіч (1814—1878). У падрыхтоўцы адкрыцця музея яму дапамагаў яго старэйшы брат Канстанцін Тышкевіч (1806—1868) і Адам Ганоры Кіркор (1819—1886), які быў членам губернскага Статыстычнага камітэта ў Вільні.

Браты Тышкевічы адмыслова вывучалі сучасную музейную справу ў гарадах Еўропы: Яўстах наведаў Скандынавію (Лунд і Капенгаген), Канстанцін пабываў у Кракаве, Празе, Загрэбе, у Аўстрыі прымаў удзел у раскопках у Гальштаце. У 1851 г. губернатар Г. Бібікаў атрымаў праект Музея старажытнасці ў Вільні і далажыў пра яго цару Мікалаю I. Яўстах Тышкевіч абвясціў, што ён аддасць музею свае калек-

цыі і бібліятэку. Якраз у гэты час Расійская адміністрацыя пачала шукаць неабходныя дакументы, якія б пацвердзілі ідэю адзінай Расіі і «адвечнай» еднасці Літвы і Беларусі з Расіяй. Тышкевіч таксама прапанаваў акрамя музея стварыць Археалагічную камісію. Камісія павінна была займацца даследаваннямі і кансервацыяй старажытных актаў і рукапісаў, якія датычыліся гісторыі Заходняй Расіі, а таксама апрацоўкай і публікацыяй важных дакументаў.

Толькі пасля смерці Мікалая I, новы цар Аляксандр II 29 красавіка 1855 г. падпісаў загад аб стварэнні Музея старажытнасцей і Археалагічнай камісіі ў Вільні. Камісія збірала і вывучала старажытнасці, арганізоўвала раскопкі, выдавала на іх дазвол. Было надрукавана некалькі тамоў «Запісак археалагічнай камісіі» і шэраг краязнаўчых прац. К.П. Тышкевіч сфармуляваў канкрэтныя планы раскопак гістарычных помнікаў. Ён жа даследаваў каля 200 курганоў, гарадзішчаў і замчышчаў Мінскай губ., склаў іх тапаграфічныя планы. А. Кіркор раскопваў курганы ў Ашмянскім, Барысаўскім, Вілейскім, Навагрудскім, Мінскім паветах, класіфікаваў і датаваў археалагічныя помнікі, паводле пахавальнага абраду вызначаў этнічную прыналежнасць нябожчыкаў.

Пасля задушэння паўстання 1863 г., генерал-губернатарам Літвы М. Н. Мураўёвым-вешальнікам Музей старажытнасцей быў зачынены. Улада канфіскавала 67.063 прадметы: археалагічныя і нумізматычныя калекцыі, пячаткі, этнаграфічныя, заалагічныя, мінералагічныя, батанічныя здабыткі, збор кніг, які налічваў 19.700 тамоў, а таксама дакументы, аўтографы, рукапісы, партрэты, гравюры і эстампы, бюсты. Некаторыя рэчы з калекцый апынуліся ў адчыненай у Вільні ў 1867 г. публічнай бібліятэцы. А рэчы,

якія сведчылі пра незалежную гісторыю нашага краю, былі перададзеныя ў расійскія музеі. Напрыклад, медалі, манеты, пячаткі патрапілі ў Румянцаўскі музей у Маскве, партрэты, бюсты і частка зброі — у царскі палац у Гатчыне. Археалагічную камісію распусцілі, цалкам забаранілі ўсялякую работу ўсім таварыствам і грамадскім аб'яднанням, усыпіўшы тым усё грамадскае жыццё на Беларусі. Даследчыцкая дзейнасць у «забраным» краю зноў была спынена.

Вось пры такіх абставінах малады даследчык Вандалін Шукевіч пачынаў сваю навуковую дзейнасць.

## БІЯГРАФІЯ ДАСЛЕДЧЫКА

Вандалін нарадзіўся ў сям'і адваката Аляксандра Шукевіча і Аліны Воўк-Карачэўскай. Род Шукевічаў паходзіў са Жмудзі, з вёскі Шукяны, якая знаходзілася каля Панявежа, адкуль у XVII ст. Шукевічы перабраліся ў Слонімскі павет. Перад Гарадзельскай уніяй род валодаў у Троцкім павеце нейкай маёмасцю, аб чым 8 сакавіка 1799 г. Цыпрыян Шукевіч, даказваючы сваё шляхецкае паходжанне перад судом пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, прадставіў адпаведныя дакументы. Аўтар кнігі пра Вандаліна Шукевіча прафесар археалогіі Лодзкага ўніверсітэта, доктар Мар'яна Магдалена Бломберг падала цікавую інфармацыю пра некаторых прадстаўнікоў рода Шукевічаў:

1. Казімір, у сярэдзіне XVII ст. перасяліўся са Жмудзі ў Слонімскі павет і тут пад залог атрымаў фальварак Ярашоў. Паміраючы, ахвяраваў суму, якую меў ад Ярашова, слонімскім бенедыкцінам, фальварак перайшоў ва ўласнасць яго сына.

2. Марцін выплаціў суму, якая належала бенедыкцінам, і 23 красавіка 1717 г. купіў маёнтак Палонка ў

Казіміра Бучынскага. Меў сыноў: Аляксандра, які быў езуітам, Дажбога, які быў слонімскім ротмістрам, і Багуслава.

3. Багуслаў спярша быў слонімскім гарадскім суддзёй, потым рэгентам Галоўнага літоўскага трыбунала, крайчым і стражнікам, паслом на канвакацыйны сейм, прысутнічаў на каранацыі Станіслава Аўгуста ад слонімскага земства. Ажаніўся на Ізабэле Пратасевіч, з якой меў сем сыноў: Адама, Станіслава, Антона, Юзафа, Аляксандра, Міхала і Ігната.



*Вандалін Шукевіч*

4. Ігнат быў абраны паслом на Чатырохгадовы сейм, таксама быў дэпутатам і пісарам Галоўнага Літоўскага трыбунала, абозным, канюшым і земскім пісарам у Слоніме. Валодаў маёмасцю (Дворышчам у Лідскім і Тракелямі ў Ашмянскім паветах, якія купіў 9 чэрвеня 1789 г. у Станіслава Гуроўскага, маршалка ВКЛ, пацверджанай у Малой літоўскай метрыцы. У Тракелях знаходзілася капліца з пахаваннямі Шукевічаў. Ігнат пакінуў пяцярых сыноў: Фаўстына, Алозія, Хрызастома, Цыпрыяна і Фабіяна.

5. Фабіян — дзед Вандаліна Шукевіча. Ён быў старшынёй крымінальнай судовай палаты ў Гродне, а з 1837 г. — лідскім гарадскім рэгентам і таму стала пасяліўся ў Лідзе. Валодаў маёнткам Гайкаўшчына ў Лідскім павеце. У маладосці пісаў вершы, у 1808 г. нават выдаў томік вершаў у Гродне. Фабіян ад першага шлюбу меў сына і дачку, ад другога — васьмярых дзяцей, з якіх Аляксандр быў бацькам Вандаліна.

6. Аляксандр (нар. 29.11.1819) скончыў школу піяраў у Лідзе і працаваў прыватным адвакатам. Пастаянна пражываў у Лідзе, вёў актыўнае грамадскае жыццё. Часта наведваў ксяндза Антонія Ясінскага — пробашча касцёла ў Начы. Там пазнаёміўся з сваёй будучай жонкай Алінай, дачкой уладальніка Начы Мацея Волк-Карачэўскага і Ганны з дому Кацпшыцкіх. Аліне тады было 16 гадоў, яна была навучэнкай школы пры кляштары Сясцёр Міласэрных у Шчучыне. Волк-Карачэўскі не хацеў нават чуць пра яе шлюб з Шукевічам. Таму без ведама бацькі, але са згоды маці, ксёндз Ясінскі даў маладым шлюб. Урачыстасць адбылася ў 1847 г. у Бернардынскім касцёле ў Вільні. Калі пра гэта даведаўся бацька, ён збіў маці і дачку і выгнаў іх з дому. Маці спачатку пасялілася ў Тальмонтах не-

далёка ад Ліды, потым перабралася да брата, які меў аптэку ў Шчучыне. Аліна пераехала да мужа ў Ліду.

7. Потым Карачэўскі раскаяўся ў сваім учынку, прабачыў жонцы і дачцэ. Жонка, дачка і зяць пераехалі ў Начу. Стары ўладальнік Начы спадзяваўся, што зяць пераймe пасля яго кіраванне маёнткам. Аднак Аляксандр у хуткім часе пачаў канфліктаваць з цесцем, пакінуў сям'ю і зноў выехаў на пастаяннае пражыванне ў Ліду. Праведваў дзяцей толькі з нагоды свят. Сустрэчы адбываліся не ў маёнтку, а ў плябаніі, куды стары слуга Карачэўскага прыносіў дзяцей — Ідалію (1850—1919) і Вандаліна. Аляксандр памёр у Лідзе 22 снежня 1891 г. і быў пахаваны ў капліцы ў Начы. Яго жонка Аліна памерла 18 лістапада 1905 г. (ва ўзросце 74 гадоў) у Зубішках, дзе яна жыла ў дачкі і таксама была пахавана ў Нацкай капліцы.

* * *

У нататках Вандаліна Шукевіча ёсць інфармацыя, якая датычыць яго радаводу з боку маці. Прабабка з боку маці Разалія паходзіла з роду Халадніцкіх, якія мелі ўласны дом у Варшаве на Старым Месце. Прадзед з боку маці, Марцін Каспшыцкі паходзіў з Кракава, але атрымаў пасаду аканома ў князя Любецкага ў Літве. Тайна, у касцёле Св. Ганны ў Варшаве, уступіў у шлюб з Разаліяй Халадніцкай. Прадзед Марцін памёр раптоўнай смерцю ў Варшаве паміж 1813—1818 гг. і пахаваны ў падзямеллі касцёла Святога Крыжа. У 1841 г. Мацей Волк-Карачэўскі купіў Начу ў Тамаша Паплаўскага.

Такім чынам, маёнтак Нача з'яўляўся маёмасцью маці будучага гісторыка Аліны з дому Волк-Карачэўскіх. Менавіта мясцовасць вакол роднай Начы ўсе жыццё вывучаў археолаг Вандалін Шукевіч. Тэадор Нарбут, які таксама ўсе жыццё пражыў недалёка

ад Начы і пахаваны каля Нацкага касцёла, сцвярджаў, што гэтая мясцовасць мае старажытную гісторыю, у свой час яна была заселена нейкім балцкім племенем, якое звалася Насці. Шукевіч паказаў, што ягоныя родныя мясціны, пачынаючы з каменнага веку, заўжды мелі сталае насельніцтва.

Сябра Вандаліна — Юзаф Ядкоўскі, вывучаючы ў былым архіве Міністэрства юстыцыі ў Маскве акты Літоўскай метрыкі, даведаўся, што ў 1517 г. Нача была спадчынай Венсела Станьковіча і Марціна Радзівілавіча, якую яны потым прадалі баярыну Радуньскага павета Шымку Міктавічу, а з 1526 г. Нача пераходзіць ва ўласнасць Януша і Марыі Касцевіч. Першы касцёл Бязгрэшнага зачацця ў Начы быў пабудаваны Марыяй, у той час ужо ўдавой Януша Касцевіча, дзедзічкай на Вагруве (у Падлескім ваяводстве), і асвечаны 29 снежня 1529 г. Фундатарка прыпісала да касцёла кавалак зямлі для плябаніі, сенажаці каля Начы і Раклішак пры дарозе на Араны, лес пры Радуньскай дарозе, 7 сялян з зямлёй, 2 селяніна без зямлі.

Пасля 1559 г. Нача належала Кішкам і Радзівілам. Пасля 1631 г. тут пасяліліся татары, нашчадкі якіх і па сённяшні дзень жывуць у суседняй вёсцы Некрашунцы. З 1690 г. маёнтак з'яўляецца ўласнасцю Людвіка Даўгірда.

Наступны драўляны касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў 1750 г. пабудаваў за свой кошт у Начы ксёндз-пробашч Юзаф Курчэўскі. Касцёл пабудаваны ў традыцыях народнага дойлідства з рысамі барока. Першапачаткова ён быў вельмі невялікім — 18 метраў у даўжыню і 10 метраў у шырыню, меў неф працягласцю 14 м. Касцёл быў збудаваны ў форме крыжа, з паўкруглай апсідай і дзвюма вежамі. Прэсбітэрый ад нефа аддзяляла бэлька з крыжам і анёламі па баках.

Новы касцёл, пабудаваны ў стылі неаготыкі, быў асвечаны ў 1910 г.

У свой час Вандалін Шукевіч надрукуе ў газеце «Літоўскі кур'ер цікавы артыкул пра Нацкі касцёл (Szukiewicz W. Stary kosciolek w Naczy // «Kuryer Litewski», 1910, № 152).

Але вернемся да біяграфіі нашага героя.

Пасля нараджэння Вандаліна бацькі развяліся, і ўвесь цяжар выхавання лёг на маці і бабку. Бабка і маці былі добра адукаванымі і рэлігійнымі людзьмі, менавіта яны фарміравалі характар будучага вучонага і займаліся яго адукацыяй. У маёнтку была добрая бібліятэка з цікавымі кнігамі, было фартэпіяна, на якім іграла маці і дзеля чаго з Вільні выпісваліся ноты. На выхаванні Вандаліна, бясспрэчна, адбівалася жаночае асяроддзе, ён, малодшы ў сям'і, рос хлопчыкам далікатным і эмацыйна чуйным. У маёнтку жыў стары лакей Маеўскі — разнавіднасць «старога слугі» Г. Сянкевіча. Маеўскі вельмі кахаў дзяцей, клапатліва даглядаў іх і шмат расказваў. Лепшым сябрам дзяцінства Вандаліна быў яго аднагодак Людвік Кіюць — сялянскі хлопчык з блізкіх Талкунцаў. Людвік не быў бойкім хлопчыкам, але заўжды быў гатовы ўдзельнічаць з панычам ва ўсіх гульнях і пры гэтым захоўваць дзіцячыя таямніцы. Хоць потым іх жыццёвыя дарогі, вядома ж, разышліся, навуковец-археолаг ніколі не забываў свайго сябра дзяцінства.

Сістэма адукацыі была цалкам зрусіфікавана і таму малога Вандаліна не аддалі ў звычайную школу, а пачалі даваць хатнюю адукацыю. Першым дамашнім настаўнікам стаў сябар паэта Сыракомлі (Людвіка Кандратовіча) і таксама паэт Уладзіслаў Абакановіч. Цікава, што Абакановіч раней быў дамашнім настаўнікам у Нарбутаў, у Шаўрах. Настаўнік вучыў Ванда-

ліна і яго сястру Ідальку пісьму і літаратуры, пісаў для іх вершыкі. Абакановіч перадаў Вандаліну сваё захапленне паэзіяй і літаратурай. Нават калі дзеці выраслі, ён на правах амаль што члена сям'і застаўся жыць у Начы, займаўся агародніцтвам. Тут жа, у Начы, быў пахаваны. Першапачаткова музыцы дзяцей вучыла Юстына Слядзінская, а потым Кацярына Крупавіс.

Дапамагаў вучыць дзяцей іх дзядзька па бацьку Атаназ Шукевіч. Гэта была яго ідэя аддаць дзяцей працягваць адукацыю да былога прафесара Віленскага ўніверсітэта, батаніка Юзафа Юндзіла, які хоць і быў ужо тады чалавекам сталага веку, але захаваў ясны розум, выдатна ведаў прыродазнаўчыя навукі і, галоўнае, быў прыроджаным педагогам, які не толькі перадаваў дзецям свае веды, але і заахвочваў іх да самастойных даследаванняў прыроды. Акрамя прыродазнаўчых навук, прафесар выкладаў гісторыю краю, прычым і тут вучыў думаць, аналізаваць і адстойваць свае погляды. Акрамя Шукевічаў, на лекцыі да Юндзіла прыходзілі Аляксандр і Станіслаў Слядзінскія, сыны вядомага віленскага мастака. Усе разам яны хадзілі ў экскурсіі вакол Вільні, збіралі расліны для гербарыяў і насякомых для энтамалагічных калекцый. Вандалін асабіста сабраў цікавы гербарый. Маляваць Шукевіч вучыўся ў Вінцэнта Слядзінскага.

У 1869 г. для працягу адукацыі маладыя Шукевічы прыехалі ў Варшаву. Вандалін пасяліўся ў дзядзькі Тамаша Шукевіча, а Ідалія спынілася ў сваякоў Шукевічаў — Вайзэнгофаў. Вандалін меў намер паступіць у Галоўную школу, Ідалія наведвала вячэрнія курсы ў кансерваторыі. Аднак у 1869 г. Варшаўскую Галоўную школу зачынілі, на яе месцы арганізавалі расійскі ўніверсітэт. Каб паступіць у гэты ўніверсітэт, неабходна было здаць усе іспыты на расійскай мове, якую

малады чалавек амаль што не ведаў. Сям'я не мела дастаткова грошай, каб малады чалавек мог выехаць на вучобу ў адзін з еўрапейскіх універсітэтаў, і Вандалін пачаў рыхтавацца да іспытаў пад кіраўніцтвам прафесара на пенсіі Горы-Горыцкай сельскагаспадарчай акадэміі доктара Галаўні і прафесара Вянцкоўскага. Штудзіраваў гісторыю, геаграфію, матэматыку, французскую, нямецкую, лацінскую і рускую мовы, а ў вольныя хвіліны стараўся наведваць канцэрты і тэатры. Часта пісаў лісты да маці, ў якіх дзяліўся сваімі ўражаннямі ад горада, пісаў, як ідзе навучанне, даваў справаздачы аб грашовых выдатках. Для разумення, чым і як малады Вандалін жыў у Варшаве, цікава будзе



*Вандалін Шукевіч, Юльян Талька-Грынцэвіч і Генрых Шукевіч на раскопках у Пяткунцах каля Начы, 1907. Фота з кнігі: M. M. Blombergowa. Wandalin Szukiewicz (1852—1919). Warszawa — Lida. 2010*

працытаваць вытрымкі з аднаго з ягоных шматлікіх лістоў у Начу да маці:

Даражэнькая Мамуля! ...Нястомна займаюся вучобай, уздымаючыся вышэй і вышэй. Можа, дасць Бог, праз два гады здам іспыты ва ўніверсітэт, бо за адзін год цяжка, вельмі шмат працы. Пан Вянцкоўскі выкладае мне гісторыю, геаграфію, мовы: французскую, нямецкую і лаціну і ўсё гэта па-руску, што для мяне вельмі цяжка, аднак стараюся як магу. Сам пан Вянцкоўскі вельмі мілы чалавек, цікавы не толькі як настаўнік, але і ў паўсядзённым жыцці. Пан Высоцкі мне выкладае матэматыку, яго яшчэ добра не ведаю, бо тры разы на тыдзень прыходзіць заўжды на кароткі час, ён згадзіўся на палову рубля за лекцыю.

Тут у Варшаве будзе цяжка зладзіць справу з універсітэтам, бо зараз сюды на месцы прафесараў наслалі такога быдла і ёсць загад, каб як можна мацней абцяжарыць моладзі паступленне ва ўніверсітэт, бо ён ёсць галоўным апірышчам бунтаў. Напрыклад, нядаўна былі ўступныя іспыты пры адкрыцці ўніверсітэта, якія здавалі не толькі тыя, хто меў намер паступіць, але і тым, якія ўжо былі студэнтамі і добра вучыліся (відочна — яшчэ ў старым, «польскім» універсітэце — *Л. Л.*). Дык, напрыклад, прафесар студэнта-медыка пытаў па астраноміі, а калі не адказваў на пытанні — не прымалі. Пан Рапацкі (сваяк Шукевіча — *Л. Л.*) быў прыехаў на гэты год ва ўніверсітэт, але паглядзеў, што робіцца, і рашыў, што лепей будзе вярнуцца, каб займацца гаспадаркай на вёсцы.

Ярся Гурчына (сябра Вандаліна — *Л. Л.*) яшчэ няма і, здаецца, ён паедзе да Дрэздэна, у аграмічную школу. Трэба і мне будзе пасля заканчэння падрых-

тоўкі уцякаць куды-небудзь за мяжу, можа ў Кракаў ці Львоў, бо калі так і далей будзе мне шанцаваць, дык болей будзе шансаў патрапіць на неба, чым ва ўніверсітэт. Але можа нешта зменіцца, пачакаем.

Вельмі задаволены кватэрай, у якой жыву, бо няма праблем з харчаваннем, як у Юндзілаў (у Вільні — *Л. Л.*), бо ёсць свая кухарка, якая заўжды добра гатуе. Маю свой асобны пакойчык, у якім ніхто мне не замінае, а як прыедзе Зянон (Зянон Камінскі з Гінэляў, 2 км ад Начы, лепшы сябар — *Л. Л.*), дык будзем у гэтым пакойчыку рыхтавацца разам. Запытайце ў Зянона, калі ён прыедзе ў Варшаву, я сустрэну яго на вакзале... Папрасіце яго, каб прывёз дамашніх масла, вяндліны, грыбоў і г. д. (...)

Павінен даць адказ, як трачу грошы. Богам і праўдай сведчу, што не марнатраўлю, купляю толькі самае неабходнае. Першае: купіў шапку за 8 злотых, бо папярэдняя парвалася. Другое: купіў пару пальчатак за два рублі. Трэцяе: заплаціў 4 злотых за папраўку капелюша. Рэшта пайшла на тэатар і іншыя дробныя рэчы, такія, як алоўкі, пёры, паперу, атрамант і г. д. Яшчэ за рамонт гадзінніка заплаціў 3 рублі, грошы мусіў пазычыць у стрыя. У тэатры не бяру квіткоў у партэр, але заўжды на галёрку (...).

Бачыш мама, ашчаджаю як магу (...) але цяжка бывае стрымацца ад пакупкі чагосьці для прыемнасці ці каб адпачыць ад вучобы, бо часта бывае так, што па два, тры дні не выходжу з хаты (...) а калі з'яўляецца вольны час, дык як не пайсці кудысьці, каб набрацца фізічнай і маральнай моцы? Лепшым месцам для адпачынку ёсць тэатар і калі там нешта добрае іграюць, дык як не схадзіць? (...) Ідальку часта ўвечары праводжу на курсы ў кансерваторыю, там панны разам з хлопцамі вучацца і таму мне

можна там пабыць, паслухаць спевы (...) Я бы таксама хацеў вучыцца калі не граць, дык хоць спяваць, час бы знайшоў, але (...) няма дзе вучыцца, бо няма фартэпіяна ... Маляваць дык буду вучыцца абавязкова. Думаю наведаць Мастацкую выставу, павінна там быць шмат цікавага, але няма з кім схадзіць, а сам не ведаю дзе знаходзіцца. Таму бязмерна злуюся, нават не ведаю, ці ёсць яшчэ такі нявольнік муз як я? (...) чую ў сабе душу вялікага артыста.

У Варшаве яшчэ мала каго ведаю, толькі тых, хто бывае у стрыя (...) Гасцяваць сам не магу, бо не маю чорнага сурдута, хоць гэта вялікае глупства, але так прынята, цяжка плыць супраць плыні (...)

Цалую ручку дарагой мамулі і бабулі і прашу, каб не забывалі і часцей пісалі да свайго Вандаліна, для якога кожнае вашае слова даражэйшае за ўсе...

Жыццё павярнулася так, што паступіць ва ўніверсітэт Вандалін так і не змог, яму прыйшлося пакінуць свае заняткі і зацікаўленасці, якія можна было рэалізаваць толькі ў вялікім горадзе.

У 1871 г. ён вярнуўся ў Начу, каб змяніць сваю бабулю ў справе кіравання маёнткам і пачаць займацца сельскай гаспадаркай. Тут ён працягвае вучыцца, купляе кнігі ў Вільні і выпісвае з-за мяжы. Паглыбляе свае веды ў гісторыі, археалогіі і прыродазнаўчых навуках. Захапляецца фізікай і асабліва астраноміяй. Яго зачароўвала зорнае неба, Вандалін шмат цёмных восеньскіх начэй свайго жыцця правеў у аматарскіх астранамічных назіраннях. Невядома, ці меў ён у Начы тэлескоп, але па грошах мог сабе дазволіць выпісаць яго з Еўропы.

Шукевічу былі цікавы ледзь не ўсе навукі, ён «праглынаў» усе літаратурныя творы і зборнікі паэзіі,



*Вандалін Шукевіч з сынамі Зыгмунтам, Раманам, Генрыхам, 1908 г.*
*Фота з кнігі: M. M. Blombergowa. Wandalin Szukiewicz (1852—1919).*
*Warszawa — Lida. 2010*

навуковыя манаграфіі. У сваіх дзённіках Шукевіч потым запісаў:

> Аднак не паддаваўся. Разбуджаная прага ведаў не давала пакою. Вырашыў вучыцца сам. Да шчасця, мог сабе дазволіць займацца навукай, якой літаральна пакланяўся. Шмат чытаў, імкнучыся свае веды прыводзіць у сістэму, паступова павялічваючы агульны далягляд. У той час у мне прачнулася замілаванне да археалогіі. З маладых гадоў мяне цікавіла мінулае чалавецтва, а самым цікавым для мяне прадметам была старажытная гісторыя. Пасля адкрыцця дагістарычных могілак каля Начы, мае інтарэсы вызначыліся, я стаў вывучаць археалогію. Вучыўся прама на тых могілках, раскопкі вёў акуратна, скрупулёзна ўсё запісваючы.

Добрымі сябрамі сталі суседзі Юзэфа і Браніслаў Ёчы з Галадоўкі, людзі высакародныя, гаспадарлівыя і добра адукаваныя. Сям'я Ёчаў была культурным цэнтрам, вакол каторага праходзіла навакольнае грамадскае жыццё. Дом Ёчаў не абыходзілі бокам вандруючыя па Віленшчыне знакамітасці, напрыклад, Мар'я Канапніцкая і мастачка Дулэмба, а таксама розныя суседзі з бліжэйшых і дальніх ваколіц. Сяброўства Вандаліна Шукевіча з сям'ёй Ёчаў доўжылася да апошніх дзён яго жыцця, яны падтрымлівалі адзін аднаго ва ўсіх справах, археолаг часта гасцяваў у іх, а яны цешыліся яго навуковымі поспехамі.

Першай жонкай Вандаліна была Браніслава, дачка Пятра і Магдалены з сям'і Сямашкаў-Паўловічаў, дачка чыноўніка курыі біскупаў у Вільні. З ёй меў сына Рамана Зыгмунта, які нарадзіўся 5.07.1884 г. і дачку Ванду Аліну, якая нарадзілася 28.11.1885 г. Дачка выйшла замуж за Нарбута.

Першая жонка Вандаліна хутка памерла — 18 лістапада 1885 г.

Пасля смерці Браніславы, у 1888 г. Шукевіч ажаніўся другі раз з Юліяй Камінскай — дачкой Юлія і Стэфаніі з Паплаўскіх-Камінскіх. Апекуном Юліі быў Браніслаў Ёч і менавіта ў Ёчаў Вандалін Шукевіч пазнаёміўся з будучай жонкай, а потым насуперак нежаданню апекуна, вырашыў жаніцца на ёй. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся сыны Зыгмунт (9.03.1890 г.) і Генрых (22.03.1899 г.).

Але другі шлюб аказаўся вельмі няўдалым, паміж мужам і жонкай было няшмат агульнага. Юлія была асобай простай, але запальчывай, не разумела навуковых інтарэсаў мужа, часта лаяла яго за пакупку кніг і часопісаў, за інтарэс да навуковай дзейнасці, бо лічыла гэта марнатраўствам часу і грошай. Раз за разам смяротна крыўдзілася на мужа з-за выдаткаваныя Вандалінам велькія грошы на раскопкі. Сяброў-вучоных, якія надведвалі мужа ў Начы, называла старымі дармаедамі.

Спрэчкі і лаянкі ўсё больш узмацняліся і ў выніку ў 1902 г. Юлія пакінула дом і перасялілася да сваіх бацькоў, якія жылі ў Ягялавічах. Вандалін шмат разоў прасіў жонку вярнуцца ў дом, але яна заўжды адмаўлялася.

Юлія пачала судзіцца з мужам і адсуджваць у яго вялікія сумы грошай, чым прывяла да ўпадку маёнтак Нача. Па выніках аднаго з працэсаў супраць мужа, які Юлія выйграла, Шукевіч вымушаны быў заплаціць жонцы 7 000 рублёў — вялікая па тых часах сума грошай для ўладальніка невялікага маёнтка. У сваіх пісьмах да апякункі яго дзяцей Вандалін Шукевіч напісаў пра жонку:

Сваім балаганам і злой воляй давяла дом да развалу і, нарэшце, спагнаўшы праз суд належачыя ёй, па яе словах, грошы, прымусіла прадаць палову Начы...

Біяграфія Шукевіча з'яўляецца добрым прыкладам таго, як цяжка спалучаць захапленне навукай і актыўны ўдзел у культурным жыцці роднага краю з няўдалым шлюбам з асобай, сэнсам жыцця якой з'яўляецца выключна барацьба за грошы, без якой-небудзь духоўнай зацікаўленасці.

Тым не менш Вандалін усё болей паглыбляўся ў заняткі археалогіяй, трациў на гэта ўвесь вольны час і таму не меў магчымасці займацца хатняй гаспадаркай і выхаваннем дзяцей. Неўзабаве ў якасці хатняй гаспадыні з'явілася далёкая сваячка Шукевічаў з Вільні Станіслава Юхневіч. Калі ж сыну Вандаліна Зыгмунту споўнілася пяць гадоў, менавіта Станіслава пачала вучыць яго чытаць і пісаць.

У 1896 г., каб вучыць старэйшых дзяцей, Вандалін пераязджае ў Вільню і арандуе там дом, у якім жыве разам з старэйшымі дзецьмі. Пераезд у Вільню тлумачыўся тым, што іншагароднія вучні не мелі дазволу арандаваць кватэры і таму павінны былі жыць у інтэрнаце пад сталым кантролем і прэсам афіцыйнай русіфікацыі. У Начы засталася Станіслава Юхневіч, яна даглядала гаспадарку і гадавала малых дзяцей. Падрастаючыя сыны вучыліся ў Вільні і заставаліся пад уплывам бацькі.

Акрамя прыбыткаў ад маёнтка Нача, крыніцай даходаў Шукевіча падчас жыцця ў Вільні стала кнігарня. Заняцца гандлем кніг падгаварыў Шукевіча яго сябар, выдавец папулярных і танных кніг Зыгмунт Нагродскі. Дарэчы, да некаторых з кніг, якія выдаваў

Нагродскі, Шукевіч нават пісаў прадмовы. Кнігарня месцілася на Дамініканскай вуліцы — у бойкім і добрым для гандлю месцы. Шукевіч сам падбіраў кнігі на продаж, часцяком сам стаяў за прылаўкам. Як доўга Ванадалін займаўся кніжным гандлем, невядома, але праз нейкі час ён пакінуў сабе толькі працу ў Таварыстве сяброў навук.

Сыны Вандаліна ўдзельнічалі ў падзеях рэвалюцыі 1904—1905 гг., ім маглі пагражаць рэпрэсіі з боку ўладаў, таму яны былі вымушаныя на нейкі час пакінуць Вільню і жыць у Начы ці ў маёнтку сваёй маці ў Ягялавічах.

Стан здароўя Вандаліна Шукевіча ў гэтыя часы пачаў пагаршацца і ён таксама ўсе часцей жыў на вёсцы, запрашаючы да сябе сяброў-вучоных. У гэты перыяд у яго доўга гасцяваў прафесар Юльян Талька-



*Станіслава Юхневіч, Вандалін Шукевіч, Юльян Талька-Грынцэвіч, Юзаф Ядкоўскі. Фота з кнігі: M. M. Blombergowa. Wandalin Szukiewicz (1852—1919). Warszawa — Lida. 2010*

Грынцэвіч, з якім разам даследаваліся пахаванні ў Ланкішках каля Начы. Яны падрыхтавалі да друку справаздачу аб выніках гэтых даследаванняў.

Некалькі разоў у Начы наведваў Шукевіча гарадзенец Юзаф Ядкоўскі. Па запрашэнні гаспадара ў Начы пабываў Казімір Кульвець з Варшавы — сузаснавальнік і старшыня Польскага краязнаўчага таварыства. Разам з ім гасцяваў член гэтага таварыства, батанік з Вільні Кароль Карповіч. Усе разам даследавалі флору Нацкай пушчы і бліжэйшых азёр, знайшлі некалькі раслін, якія рэдка сустракаюцца ў нашых мясцінах.

1909 г. археолаг правёў у сваім маёнтку, што бачна з копіі «Книги о исповедующихся и причащающихся Начской Римско-Католической церкви» за 1909 г., якую мае аўтар. У гэты год да Нацкага касцёла з маёнтка Нача былі прыпісаны Вандалін Мацей Шукевіч (узрост — 57 год) разам з сынам Генрыхам (9 год), унучкай Алінай Раманаўнай (1 год), а таксама Станіслава Іванаўна Юхневіч (29 гадоў).

Праз доўгі час жонка наважылася вярнуцца, але тады ўжо пастарэўшы, з хворым сэрцам, Шукевіч адмовіўся ад яе сам. Швагер Вандаліна, Пётр Сядлікоўскі ўгаварыў зяця Вандаліна Нарбута купіць Начу. Ва ўмове, якая тычылася продажу, Шукевіч запісаў, што пажыццёва пакідае сабе дом, агарод і сад, пры тым будзе атрымліваць некалькі сотняў пудоў збожжа ў год і трымаць для сябе пару кароў і каня. Такое рашэнне справы давала яму магчымасць застацца ў Начы, да якой быў вельмі прывязаны, і, галоўнае, стварала прымальныя матэрыяльныя ўмовы жыцця і заняткаў археалогіяй. Акрамя гэтага, Шукевіч завёў пасеку, прадукты пчалярства з якой прыносілі яму дадатковы даход. Усё гэта адбылося ў 1911 г., ужо пас-

ля смерці дачкі Вандаліна ад першага брака — Ванды, жонкі Нарбута.

У Начы Шукевіч арганізаваў кааператыў і краму, а таксама стварыў земляробчы гурток для падвышэння ўзроўню прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. У «Літоўскім кур'ерэ» у 1910 г. Шукевіч пісаў, што 28 лютага яго абралі старшынёй земляробчага гуртка і губернатар зацвердзіў устаў. На пачатку гурток адчыніў краму, якая давала добры прыбытак таварыству. Шукевіч часта за ўласныя грошы выпісваў насенне, якое потым раздаваў сялянам на выпрабаванне. Калі ўраджай быў добры, сяляне прыходзілі да Шукевіча з просьбай, каб на наступны год ён замовіў такога насення больш і толькі тады расплачваліся. Па прапанове Віленскага земляробчага таварыства Шукевіч арганізаваў 5 эксперыментальных палёў для выпрабавання штучных угнаенняў, новых гатункаў бульбы і аўса. Сябры сельскагаспадарчага гуртка ў Начы таксама купілі жаткі і падчас збору ўраджаю мелі ад іх вялікую карысць. Пра дзейнасць сельскагаспадарчага гуртка В. Шукевіч апублікаваў справаздачу ў віленскім часопісе «Світанак» («Jutkzenka»).

Гэта былі апошнія гады перад надыходзячай вайной.

З пачаткам Першай сусветнай вайны Шукевіч назаўжды вярнуўся ў Начу.

Доўгія гады сусветнай вайны, а потым рэвалюцыі разбурылі гаспадарку ва ўсім краі. Расійскія і нямецкія войскі, розныя банды, рэквізіцыі прадуктаў прывялі да голаду. Сітуацыю для Шукевіча выратоўвала хатняя гаспадыня Станіслава Юхневіч, якая ездзіла ў Вільню ці ў розныя мястэчкі, дзе здабывала нешта з ежы. Дапамагала Вандаліну яго сястра Ідалія Сядлікоўская і нават былая жонка, маёнтак якой, на шчасце, не быў знішчаны і абрабаваны.

У Начы Шукевіч заснаваў савет воласці і быў абраны яго старшынёй. У 1916—1917 гг. у наваколлях Начы ён адчыніў 18 школ пачатковага узроўню, запрасіў настаўнікаў з горада, забяспечыў дзяцей падручнікамі, алоўкамі і г. д.



УСТАВЪ
ОБЩЕСТВА
ЛЮБИТЕЛЕЙ НАУКЪ
въ г. ВИЛЬНѢ.

*Вокладка статута Таварыства сяброў навук у Вільні, 1907*

Для школ Шукевіч пазычаў кнігі з уласнай бібліятэкі, прычым кнігамі карысталіся не толькі моладзь, але і сталыя людзі. Як старшыня рады воласці, прыглядаў за працай настаўнікаў і напісаў для іх падручнік «Абавязкі народных настаўнікаў», які з-за вайны не быў надрукаваны і разыходзіўся ў рукапісах.

Яшчэ да пачатку вайны, пасля атрымання сярэдняй адукацыі, сыны Шукевіча выехалі ў Пецярбург на вучобу і таму падчас вайны былі мабілізаваныя ў войска. Удзельнічалі ў ваенных дзеяннях на франтах ад Вільні да Кіева, ваявалі ў Галіцыі. Пасля рэвалюцыі Зыгмунт трапіў у польскі корпус генерала Доўбар-Мусніцкага. Пасля раззбраення корпуса, жаўнеры, якія паходзілі з Беларусі, былі перавезены ў Коўна і інтэрніраваны там у крэпасці. Праз нейкі час немцы выдалі ім дакументы і былыя жаўнеры разышліся па дамам. З вяртаннем сына матэрыяльнае становішча сям'і ў Начы палепшылася.

30 кастрычніка 1919 г. у Ягялавічах памерла другая жонка Шукевіча, Юлія. Вандалін не мог удзельнічаць у пахаванні, бо ўжо сам быў у дрэнным стане, але распарадзіўся, каб Юлію пахавалі ў сямейнай капліцы Шукевічаў, каля Начы, якую яго прабабка Ганна пабудавала ў 1855 г. у стылі класіцызму.

Хутка, у лістападзе, памерла сястра Ідалія Сядлікоўская.

Стан здароўя Вандаліна Шукевіча таксама пагаршаўся, аднак 1 снежня 1919 г., за гадзіну да сваёй смерці ён яшчэ старшынстваваў на пасяджанні мясцовага земляробчага гуртка і нават пісаў пратакол. Таму яго смерць для ўсіх, хто яго ведаў, была раптоўнай. Першай з суседзяў да памёршага прымчалася яго старая сяброўка Юзэфа Ёч.

Археолаг быў пахаваны ў той жа сямейнай капліцы каля сваіх бацькоў, дачкой Вандай і яе маленькай дачушкай, жонкай Юліяй і сястрой Ідаліяй.

У 1923 г. сыны Шукевіча падзялілі спадчыну бацькоў. Начу атрымалі Раман Шукевіч і пляменнік Ідаліі, Зыгмунт і Генрых падзялілі маёнтак маці ў Ягялавічах.

Капліца з пахаваннямі сям'і Шукевічаў доўгі час стаяла разбуранай, бо навакольныя людзі мелі Шукевіча за скарбашукальніка і таму разлічвалі знайсці там скарб. У 2004 г. капліцу давялі да ладу, зараз у ёй ёсць алтар і склеп з парэшткамі Вандаліна Шукевіча і яго сям'і.

## НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Малады Шукевіч арганізаваў у Начы сельскагаспадарчае таварыства, але хутка пераключыўся на заняткі археалогіяй і этнаграфіяй.

Амаль што кожны год, пачынаючы з 1883 г., Вандалін Шукевіч даследаваў археалагічныя помнікі на паўночным захадзе Беларусі і поўдні сучаснай Летувы. Яго ранейшае добрае знаёмства з ваколіцамі і частыя вандроўкі давалі яму магчымасць знайсці сляды старых селішчаў і пахаванняў. Першыя археалагічныя назіранні, першыя адкрыцці курганоў і пахаванняў, пазначаных вялікімі камянямі, абудзілі яго далейшую цікаўнасць да археалагічных даследаванняў. На працягу 35 гадоў ім праводзіліся археалагічныя раскопкі, падчас якіх ён знайшоў сотні розных археалагічных помнікаў.



*Знаходкі Шукевіча, ілюстрацыя да артыкула «Раскопкі ў лідскім павеце». «Ілюстраваны штотыднёвік». 1885 г.*

Яшчэ Т. Нарбут згадваў пра свой удзел у раскопках каменнай магілы ў Начы, дзе былі знойдзеныя адна цэлая каменная сякера і два абломкі сякеры (Dziei... T. 1, s. 369.). Тым не менш, выбітны рускі археолаг А. А. Спіцын менавіта Шукевіча вызнаваў за чалавека, які адкрыў каменныя магілы; ён пісаў:

> ...гонар адкрыцця і даследавання каменных магіл Лідскага павета належыць тутэйшаму землеўладальніку Вандаліну Аляксандравічу Шукевічу (маёнтак Нача) (А. А. Спицын. Предполагаемые древности Червоной Руси. Записки Императорского Русского Археологического общества. Кн. 4., 1899. Т. XI. С. 303).

Каменныя магілы — пахавальныя помнікі X—XVII ст. вылучаны сучаснай навукай у асобны археалагічны тып старажытнасцяў беларускага Панямоння. Яны вызначаюцца наяўнасцю каменных вымастак над магіламі.

Даследчык адкапаў каменныя магілы, выкладзеныя да самага дна камянямі, прычым на глыбіні каля паўтара метра ляжалі выпрастаныя чалавечыя шкілеты галавой на захад. Рукі былі выцягнуты ўздоўж бакоў ці скрыжаваны на жываце або грудзях. У некаторых магілах шкілеты былі абстаўлены дошкамі. Артыкул «Раскопкі ў лідскім павеце» пра гэтыя пахаванні Шукевіч апублікаваў у «Ілюстраваным штотыднёвіку» за 1885 г.

Паміж 1884 і 1894 гг. Шукевіч знайшоў 27 пахаванняў у Вензаўшчыне, 14 у Апанаўцах, 39 каля Дварчан, 6 каля Сабакінцаў, 8 каля Забалаці, 7 у Некрушанцах, 19 у Пузелях, усяго 120 пахаванняў у 8 могільніках. Напрыклад, каля Начы, на палях ваколіцы Пузелі, знаходзяцца старадаўнія каменныя магілы, дзе былі

знойдзены пры мужчынскіх касцяках сякеры, нажы, наканечнікі дзіды і г. д., а пры жаночых — разнастайныя бронзавыя ўпрыгажэнні: пярсцёнкі, завушніцы, бронзавыя дыядэмы з бронзавымі ці пазалочанымі сярэбранымі падвескамі, шкляныя пацеркі рознай велічыні і шмат іншага. У Пузельскіх магілах былі знойдзеныя арыгінальныя бронзавыя ключы-падвескі і два літоўскія дынары. Усе пахаванні мелі сцены, выкладзеныя камянямі ад дна да верху. Зверху магілу пакрывалі каменныя муроўкі авальнай формы з вялікімі камянямі ў галавах, на адным такім камяні пры адной з магіл быў выбіты чатырохканцовы крыж.

Са справаздач Шукевіча, якія ён дасылаў у Імператарскую Археалагічную Камісію (гэтыя дакументы зараз захоўваюцца ў архіве Інстытута археалогіі Расійскай акадэміі навук у Пецярбургу), бачна, што знойдзеныя ім каменныя магілы ўяўляюць сабой каменныя круглыя пляцоўкі, выкладзеныя 3—4 шэрагамі камянёў, некаторыя магілы выкладзены ў адзін шэраг камянёў. Сустракаюцца магілы, у галавах якіх пастаўлены на рабро вялікі камень. Некаторыя магілы мелі агароджу з рэдка расстаўленых камянёў і некалькімі камянямі пасярэдзіне. Археолаг знайшоў у магілах манеты: дынар Кейстута, пражскі грош Вацлава III, грош Вільгельма другой паловы XV ст., паўгрош Аляксандра Ягелончыка і г. д.

Шукевіч выдзеліў мужчынскія і жаночыя пахаванні. У адным з пахаванняў захаваліся фрагменты адзення памерлай, а на яе ілбе знаходзіліся арнаментаваныя бляшкі з бронзы, нашытыя на палатно. Побач з бляшкамі было знойдзена некалькі дробных шкляных пацерак. Такія ж шкляныя пацеркі знаходзіліся на шыі. Рукі ўпрыгожвалі два бранзалеты, зробленыя са скручанага бронзавага дроту, на пальцах — два

пярсцёнкі, адзін сярэбраны, другі з бронзы. Каля левага боку на фрагменце суконнай тканіны, якая добра захавалася, былі нашытыя дзве гафткі з бронзавага дроту. Таксама быў знойдзены кавалак скуры з вышыўкай і прасла з мяккага вапняку.

У іншым пахаванні, апроч бляшак, нашытых на тканіну, галаву нябожчыцы аздаблялі сярэбраныя завушніцы круглай формы. На шыі і грудзях памерлай ляжалі бронзавыя званочкі, белыя шкляныя пацеркі і кавалкі скручанага ў спіраль дроту. Каля левага пляча былі знойдзены два ключа з бронзы. На абодвух прадплеччах знаходзіліся бранзалеты з арнаментаванай тонкай сярэбранай стужкі. На пальцах два бронзавыя і два сярэбраныя пярсцёнкі. Каля галавы знаходзіўся гліняны посуд, упрыгожаны крывалінейным арнаментам.

У іншай магіле на грудзях памерлага бронзавая пражка, прымацаваная да кавалка скуры, пры левай руцэ — жалезная, моцна заржавеўшая сякера, вастрыём



*Нача ў 2010 г.*

накіраваная ў напрамку нагі памерлага. Каля сякеры ляжала вастрыё дзіды («Тыгоднік ілюстраваны», 1885 г.).

Па выніках даследавання каменных магіл Шукевіч падзяліў каменныя магілы на два тыпы, якія адрозніваліся формай насыпаў. Адзін тып меў насыпы ў форме паўкруга, у другога тыпу насыпы былі авальныя. Звычайна магілы з авальнымі насыпамі мелі камяні, пастаўленыя вертыкальна ў галаве памёршага ці на абодвух канцах насыпу. Адрозненні ў формах насыпаў каменных магіл звязаны з храналогіяй іх з'яўлення. На падставе адсутнасці ў іх манет, магілы з паўкруглымі насыпам археолаг лічыў больш старымі. У такіх магілах таксама мелася менш упрыгожванняў і зброі. А ў магілах з авальным насыпам знаходзіліся дынары часоў вялікіх князёў літоўскіх Кейстута і Вітаўта, пражскія грошы Вацлава, а таксама паўгрошы Аляксандра Ягелончыка. У магілах



*Капліца Шукевічаў каля Начы, 2010 г.*

абодвух тыпаў, адразу пад камянямі, былі чарапкі глінянага посуду, разбітыя пад ціскам камянёў.

Першапачаткова В. Шукевіч меркаваў, што каменныя магілы размяшчаюцца групамі па некалькі дзесяткаў і нават па некалькі соцень пахаванняў і найчасцей сустракаюцца на тэрыторыі паміж рэкамі Дзітва і Котра, пачынаючы ад іх вытокаў. Аналізуючы розныя пахаванні ў курганах і каменных магілах з трупапаленнем і без, ён зрабіў выснову, што

> ...людзі, прах якіх адпачывае пад гэтымі камянямі, калі не крывёю, дык культурай былі чужыя летувісам ...сумелі захаваць сваю своеасаблівасць у звычаях і абрадах.

Далейшыя даследаванні Шукевіча, пацверджаныя сучаснымі археолагамі, змянілі меркаванне аб распаўсюджванні гэтай катэгорыі пахаванняў.

У артыкуле пад назвай «Некаторыя дагістарычныя помнікі ў Лідскім павеце» (1898 г.) В. Шукевіч спрабаваў вызначыць час узнікнення каменных магіл. Ён пісаў:

> Манеты, якія былі знойдзены ў нашых магілах, дакладна вызначаюць іх век, разам з тым указваюць на не вельмі далёкую даўніну, абмежаваную выключна апошнімі часамі язычніцтва і першымі стагоддзямі пасля ўвядзення хрысціянства ў Літве, нават, здаецца, можна напэўна сцвярджаць, што больш старыя магілы не адыходзяць глыбей у мінулае, чым да XI—XII стагоддзяў (...) Можна толькі заўважыць, што чым пазнейшыя магілы, тым меней у іх знаходзіцца рэчаў, і нарэшце, на пачатку XVI стагоддзя прадметы зусім знікаюць. Некаторыя звычаі, такія, як гаршкі ў магілах ці выкладванне насыпаў камянямі, доўга захаваліся ў гэтым кутку, верагодна, аж да XVII стагоддзя.

Многія з помнікаў, адкрытых В. Шукевічам, даследаваліся таксама прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэта Э. А. Вальтэрам (Вальтэрысам). Пры канцы 1880-х гг. В. Шукевіч і Э. Вальтэр раскопвалі каменныя магілы і курганныя могільнікі. Э. Вальтэр збіраў археалагічныя матэрыялы ў басейне верхняй і сярэдняй плыні Нёмана, займаўся антрапалогіяй і, як і Шукевіч, шмат свайго часу аддаў этнаграфіі.

Пецярбургскі прафесар змагаўся з тэндэнцыйнымі русіфікатарскімі ідэямі ў навуцы. «У 1880 г., — пісаў Э. Вальтэр, — у паўночна-заходняй Русі не любілі, каб у спрадвечна рускім краі выяўляліся сляды ранейшых народаў, асабліва прускага і яцвяжскага». Пасля 1920-х гг. дзейнасць Э. Вальтэра працягвалася ў незалежнай Літве, дзе ён доўгі час працаваў прафесарам Каўнаскага ўніверсітэта.

Шукевіч таксама праводзіў сумесныя раскопкі са сваім сябрам, прафесарам Юльянам Талька-Грынцэвічам. Прычым у адрозненне ад Шукевіча прафесар больш цікавіўся антрапалогіяй нябожчыкаў.

Паступова археалогія стала галоўным жыццёвым захапленнем і штодзённым заняткам Вандаліна Шукевіча. Завязаліся знаёмствы з шырокавядомымі вучонымі: Зыгмунтам Глогерам і Эразмам Маеўскім з Варшавы, усталяваліся пісьмовыя сувязі з дацэнтам Уладзімірам Дземетрыкевічам з Кракава, з прафесарамі-археолагамі з Пецярбурга Э. Вальтэрам і А. А. Спіцыным.

Даследчык разумеў, што яму бракуе адмысловых ведаў у гэтай складанай галіне навукі, таму выпісваў патрэбныя часопісы і кнігі і шмат чытаў. Заўжды добра планаваў будучыя раскопкі. Выбітны рускі археолаг А. А. Спіцын пісаў:

Поспех сп. Шукевіча тлумачыцца не гэтулькі багаццем помнікаў даўніны ў раёне яго дзейнасці, колькі сістэматычнасцю яго дзейнасці.

У 1893 г. маскоўскае Археалагічнае таварыства, якое з'яўлялася ініцыятарам сістэматычнага склікання археалагічных з'ездаў, чарговы, дзевяты з'езд арганізавала ў Вільні. Правядзенне з'ездаў у розных гарадах імперыі мела сваёй мэтай ажыўленне зацікаўленасці рэгіёнаў да ўласнай гісторыі і культуры, бо арганізатары для падрыхтоўкі з'езда запрашалі прадстаўнікоў адміністрацыі і вучоных, якія працавалі на вызначанай тэрыторыі. Гэта спрыяла ажыўленню навуковага і даследчага руху, а таксама ўзнікненню (пасля з'езда) рэгіянальных музеяў.

Арганізацыйны камітэт меў сваю сядзібу ў горадзе, які быў вызначаны для правядзення з'езда — у Вільні. У склад гэтага камітэта былі запрошаны прадстаўнікі



*Ліда на малюнку Напалеона Орды*

мясцовай інтэлігенцыі — працаўнікі статыстычных камітэтаў, настаўнікі, маршалкі шляхты. Запрасілі дапамагчы ўладальнікаў калекцый і архіваў, а таксама вядомых даследчыкаў з заходніх зямель імперыі, між іншым, Эмерыка Гуттэн-Чапскага, Рамана Сангушку, Зыгмунта Глогера, сярод іх быў і Вандалін Шукевіч. Арганізацыйны камітэт у Маскве прапанаваў усім гэтым асобам надаць тытул ганаровых членаў таварыства. Вандалін Шукевіч падрыхтаваў план экскурсіі з маршрутам, прадугледжаным так, каб даць магчымасць даведацца аб граніцах пасяленняў літоўскіх і беларускіх плямён.

На выстаўку, якая была арганізавана на з'ездзе, Шукевіч прадставіў шматлікія здабыткі, якія паходзілі з яго асабістых раскопак. Спіс археалагічных артэфактаў, прадстаўленых Шукевічам разам з Вальтэрам на выставе с'езда займае дзве старонкі друкарскага тэксту (Каталог предметов, доставленных на археологическую выставку при IX Археологическом



*Шаўры Тэадора Нарбута на малюнку Напалеона Орды*

съезде в Вильне в 1893 году. Вільна, 1893, с. 19—20). Археолаг прымаў актыўны ўдзел у пасяджэннях з'езда і на 9-м пасяджэнні зрабіў вельмі цікавы і не страціўшы на нашага часу даклад пра археалагічныя мясцовасці ў Лідскім і Троцкім паветах. У дакладзе навуковец адзначыў, што заходняя частка Лідскага павета адрозніваецца тым, што на параўнальна невялікай тэрыторыі знаходзяцца сляды старажытнага жыцця з усіх эпох — ад старажытнакаменных часоў да часоў распаўсюджвання хрысціянства. Потым ён падрабязна, на ўзроўні навукі свайго часу, апісаў гістарычныя могільнікі, курганы, селішча і гарадзішча Лідчыны.

Пасля IX з'езда Вандалін Шукевіч устанавіў пісьмовыя кантакты і абменьваўся публікацыямі з Маскоўскім археалагічным таварыствам, быў выбраны членам-карэспандэнтам гэтага таварыства.

Восенню 1903 г. Шукевічам зроблена вельмі цікавае, адразу заўважанае ў навуковым свеце, адкрыццё так званых грунтовых магіл.

Яшчэ 1901 г. даследчык патрапіў на сляды такога пахавання каля вёскі Рудня, але магіла была парушана кладашукальнікамі. Гэтая магіла знаходзілася ва ўрочышчы Сенніца, на левым беразе рэчкі, пасярэдзіне невялікага даўгаватага бугра, які меў 150 шагоў у дыяметры. Пахаванне, пакрытае камянямі, было зроблена з колатага, шчыльна выкладзенага каменю, які ствараў прастакутнік 2 × 1,5 × 0,5 м. Знутры на слоі попелу, перапаленага пяску і вугалю знаходзілася некалькі гаршкоў (ад іх засталіся толькі чарапкі). З магілы рабаўнікі выкінулі круглаватую, згладжаную з абодвух бакоў каменную плітку няправільнай формы да 15 см у дыяметры. Гэта плітка, верагодна, служыла для пакрыцця сасудаў. Ніякіх рэчыў пры

гэтых раскопках знойдзена не было. Негледзячы на вялікія намаганнні, Шукевіч не знайшоў больш другіх магіл такога тыпу ў гэтай мясцовасці.

Затое ў 1903 г. даследчык быў узнагароджаны знаходкай непарушанага могільніка такога тыпу каля Начы. Могільнік быў знойдзены на невялікім разараным пагорку сярод багністай сенажаці ў невялікай адлегласці ад саду, які быў часткай маёнтка Шукевіча. Сын Шукевіча знайшоў тут на пашы каменнае долата, пасля адмысловых пошукаў былі знойдзены два новых долата (з крэмнію і пясчаніку), а раскопкі выявілі існаванне некалькіх кладак з камяню. Магілы — шырокія ямы, глыбінёй да 0,85 м, у ямах, у адмысловых паглубленнях па кругу стаялі гліняныя урны, якія прыкрывалі невялікія камяні ў форме плітак. Па-над урнамі знаходзіліся вялікія камяні. Магілы засыпаны перамяшанай зямлёй, а пад вялікімі камянямі апынулася зусім чорная ад перапалу зямля. Сасуды ручнога вырабу, з



*Трокскі замак на малюнку Напалеона Орды*

дрэннай гліны і моцна пашкоджаны ад агню. Найлепей захавалася адна урна, упрыгожаная малюнкам свастыкі: арнамент складаецца з чатырох поўных свастык і дзвюх няпоўных (г. зн. з двума канцамі, палавінных). Па форме і арнаменту сасудаў Шукевіч адразу прылічыў гэтыя могільнікі да вельмі старажытных.

Потым, пры ўважлівым вывучэнні наваколля свайго маёнтка, даследчык знайшоў цэлае поле пахаванняў гэтага тыпу. На жаль, яны былі знішчаны доўгачасовым узворваннем зямлі. Магілы знаходзіліся толькі па адзінкавых чорных плямах, у якіх траплялiся аднаасобныя чарапкі без арнаменту. Знойдзены крамянёвы наканечнік стралы.

Падобныя магілы археолаг знайшоў таксама каля маёнткаў Чэпялюны і Зубішкі. Першы могільнік быў знішчаны ўзворваннем, аднак было бачна, што магіла ўладкавана з каменю ў форме круга. У ім знойдзены чарапкі і нават адзін цэлы груба зроблены сасуд з добрай гліны.

Грунтовы могільнік у Зубішках знойдзены Шукевічам па правільнай кучы камянёў на левым беразе раўчука Турэйкі (упадае ў р. Вярсоку, прыток Мерачанкі), такія ж могільнікі археолаг ведае і каля вёскі Моргі (ля возера Дуба), у лесе каля в. Пашкунцы і на раллі каля в. Сенканцы. Па форме і якасці вырабу посуду, навуковец аднёс гэтыя могілкі да латэну (V—I стст. да н. э.) ці да некалькі больш позняга часу.

Таксама грунтовыя магілы Шукевіч знайшоў ва урочышчы Плітніца ў 1903 г. і ва ўрочышчы Ланкішкі ў 1911—14 гг.

У 1907 г. Вандалін Шукевіч у паўночна-заходняй частцы Лідскага павета адкрыў цэлыя палі нізкіх каменных курганоў з рэшткамі трупаспаленняў. Курганы трапляюцца ў палях амаль кожнай вёскі.

Некаторыя з іх ледзь прыкметныя, іншыя бачныя вельмі выразна і складаюцца, магчыма, як пісаў археалог А. Спіцын, «з сотні вазоў каменя». Валуны выкладзены вельмі акуратна, сярод камянёў у насыпах трапляюцца чарапкі, а пад імі вуглі і пласты чорнай зямлі. Рэшткаў перапаленых костак археолаг не выявіў.

Да 1914 г. толькі ва ўрочышчы Ланкішкі Шукевіч раскапаў 170 пахаванняў ад XII—XIII ст. да XVI ст. Усе гэтыя пахаванні па абраду трупапалажэння падобныя, сярод іх шмат жаночых і дзіцячых магіл, у шэрагу выпадкаў у магілах толькі галовы ці іншыя часткі цела. 13 шкілетаў абложаны дошкамі, астатнія ляжаць проста ў зямлі. У пахаваннях знаходзіліся аскепкі сасудаў з рэшткамі нейкага арганічнага рэчыва. Розныя нажы ляжалі збоку ці ў нагах нябожчыка. Былі знойдзены 6 манетаў: найбольш ранняя — князя Вітаўта, потым 4 манеты Аляксандра Ягелончыка і адна Жыгімонта Аўгуста. З упрыгожанняў знойдзены розныя пярсцёнкі, бронзавыя скронныя колцы, завушніцы, пацеркі.

Археолаг Шукевіч даследаваў не толькі родную Лідчыну. Таксама ён праводзіў раскопкі ў ваколіцах Віцебска, Лепеля, Радашковіч, вакол возера Дрысвяты.

Сабраную інфармацыю Шукевіч абагульніў у кнізе «Нарысы з дагістарычнай археалогіі Літвы, каменная эпоха ў Віленскай губерні, частка 1». (Вільня, 1901 г., выдадзеныя Таварыствам прыхільнікаў археалогіі і чалавеказнаўства). Прафесар археалогіі Мар'яна Магдалена Бломберг адзначыла высокі навуковы ўзровень гэтай публікацыі. У кнізе ўсе археалагічныя праблемы разглядаліся на агульным еўрапейскім фоне, з улікам прац скандынаўскіх вучоных: Ведэля Сімансэна, І. І. Варсаэ, О. Мантэліуса. Шукевіч падзяліў нашу ста-

ражытную гісторыю на тры эпохі: каменную, бронзавую і жалезную і спрабаваў размясціць свае знаходкі ў храналагічным парадку, прымяняючы для гэтага мэтодыкі, распрацаваныя французам Сальмонам і чэхам Я. Н. Вольдрыхам. Аналізуючы старажытныя літоўскія каменныя прылады, параўноўваў іх са знаходкамі Г. Марцільe (Францыя) і задумваўся над тым, ці можна тэорыю гэтага навукоўца ўжываць пры аналізе нашых артэфактаў.

Аднак у пісьмах да М. Ваўжанецкага (М. Ваўжанецкі. «Вытрымкі з лістоў святой памяці Вандаліна Шукевіча», «Археалагічныя ведамасці», 1920 г., т. V) Шукевіч падкрэсліваў своеасаблівасць літоўскіх знаходак і іх адрозненне ад еўрапейскіх. Археолаг з Начы



*Стары драўляны касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Начы, пабудаваны ў 1750 г., існаваў да 1910 г.*



*Новы касцёл у Начы, пабудаваны ў стылі неаготыкі і асвечаны ў 1910 г.*

палемізаваў са сваімі папярэднікамі, якія ўсе археалагічныя помнікі ў Літве адносілі да часоў з'яўлення летувісаў на гістарычнай арэне. Шукевіч паказаў, што ўжо ў эпоху каменнага веку гэты край быў шчыльна заселены. У дадатках да кнігі, даследчык робіць археалагічны агляд каменнай эпохі Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў.

Дакладна вядома, што Шукевіч скончыў і другую частку «Нарысаў...» — эпоху металаў. У 1936 г. Антоні Грымайла-Прыбытка ў «Зямлі Лідскай» пісаў, што магчыма, кніга нарэшце будзе выдана, але, здаецца, другі том так і не быў надрукаваны.

У выніку карпатлівай працы ён набыў славу і аўтарытэт даследчыка і знаўцы мінулага нашага краю, у 1901 г. абіраецца членам-карэспандэнтам Кракаўскай Акадэміі ведаў (Akademii Umiejętności).

## ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Пасля пераезду ў Вільню, ён увайшоў у асяроддзе аматараў старажытнасці і быў абраны старшынёй таемнага Таварыства прыхільнікаў старажытнасці і чалавеказнаўства, вядомага як археалагічны гурток. Сябра гуртка добра памяталі, які лёс спасціг Віленскую Археалагічную камісію і музей старажытнасці, і таму не рэгістравалі сваю арганізацыю, а працавалі амаль што канспіратыўна. Рэгулярныя пасяджэнні праходзілі ў прыватных хатах сяброў таварыства. Сваёй галоўнай мэтай сябры гуртка мелі збор гістарычных артэфактаў, рэліквій, культурных каштоўнасцяў, а таксама абарону іх ад знішчэння ці вывазу з Вільні.

Праект такой арганізацыі паўстаў у 1898 г., ініцыятарамі яе стварэння былі гісторык і даследчык віленскіх помнікаў Казімір Падэрня (1842—1910), літаратар

і калекцыянер Люцыян Узембла (1864—1942), адвакат і натарыус Станіслаў Булгароўскі (1872—1935), горны інжынер Браніслаў Мураўскі.

Гурток пад старшынствам Вандаліна Шукевіча функцыянаваў да 1906 г., на працягу гэтага часу ў яго склад уваходзіла каля трыццаці чалавек — галоўным чынам прадстаўнікі віленскай інтэлігенцыі: пісьменнікі і мастакі, юрысты і выдаўцы, дзеячы асветы і інжынеры, сярод іх быў і Браніслаў Умястоўскі (1863—1933).

Каб прыцягнуць да супрацоўніцтва шырокія колы грамадскасці і абудзіць цікавасць да сваёй гісторыі, члены гуртка ладзілі экскурсіі ў гістарычныя мясціны: у Трокі, на рэчку Вілію, у Навагрудак, Ліду, уводзілі ў звычай практыку аздаблення і асвячэння ў дзень Усіх Святых (2 лістапада) пахаванняў вядомых у нашай гісторыі і культуры людзей. Займаліся кансервацыяй магіл віленскіх прафесараў у Росе і на Бернардзінскіх могілках, арганізоўвалі лекцыі і гутаркі для моладзі і навучэнцаў гімназій. Змяшчалі гістарычныя артыкулы ў часопісе «Пад'ём» («Pobódka»).

Таксама гурток клапаціўся пра кансервацыю жывапісу ў касцёлах Вільні. Гэтай неабходнай справай аматары гісторыі займаліся разам з вядомым касцельным гісторыкам, прапаведнікам, ксяндзом Ю. Курчэўскім.

Адной з найважнейшых мэтаў, якую імкнуўся рэалізоўваць археалагічны гурток, было выратаванне ад поўнага знікнення Трокскага замка. Замак ператвараўся ў руіны, а цэглу з яго сценаў жыхары наваколляў замка выкарыстоўвалі для будаўніцтва. Як вядомы даследчык, Вандалін Шукевіч атрымаў згоду ад імператарскай Археалагічнай камісіі ў Пецярбургу на вядзенне археалагічных даследаванняў у

замку, а таксама на правядзенне там рамонтных работ і таму на падставе дамовы арэнды з горадам Трокі ён стаў афіцыйным захавальнікам замка. Напачатку, калі пачаліся рэстаўрацыйныя работы, Шукевіч сам наглядаў за якасцю выкананых работ, але для гэтага потым наняў адмыслоўца-будаўніка.

З часам грамадскія ахвяраванні паменшыліся, а паступленні грошай у якасці сяброўскіх складак былі невялікімі, частку выдаткаў на рэканструкцыю замка пакрываў Шукевіч са сваіх даходаў. Кошты на рамонтныя работы і будаўнічыя матэрыялы былі высокімі і таму Шукевіч загадаў самастойна зрабіць адмысловую цэглу і сам купіў цэмент. Гэта прывяло да сварак у сям'і і фінансавых праблем. Але дзякуючы менавіта яго працы квадратная вежа Трокскага замка была выратавана. Шукевіч з'яўляецца аўтарам шэрага фундамэнтальных артыкулаў па гісторыі Трокскага замка.



*Старая карчма ў Начы, помнік драўлянага дойлідства і побыту, згарэла ў ноч з 14 на 15 кастрычніка 2010 г.*

Вандалін Шукевіч таксама даследаваў Лідскі і Радунскі замкі.

Ён лічыў, што так званы замак каралевы Боны ў Радуні — гэта былы двор старасты, які застаўся з часоў, калі яшчэ існавала Радунскае староства.

Пасля першай у гісторыі замка ў Лідзе рэканструкцыі 1910 г. («Літоўскі кур'ер», № 142. — 1910 г.), Шукевіч абследаваў яго разам з выбітным знаўцам помнікаў архітэктуры, ксяндзом-канонікам Казіцкім і вядомым даследчыкам мінулага Вільні Вацлавам Студніцкім: «мы аглядалі сцены як найпільней. Галоўным чынам пан Казіцкі, не зважаючы на сваю стомленасць, узлазіў некалькі разоў ажно на самы верх мура па драбіне, звязанай з дзвюх, якая ўгіналася над кожным крокам».

Вучоны са скрухай адзначае:

> Незайздросны лёс помнікаў мінулых вякоў у нашым краі! Дзесьці там, у цывілізаванай Еўропе як урады, так і грамадства атачаюць такія помнікі клапатлівай апекай, шануюць іх, амаль пакланяюцца, сцерагуць ад усялякай шкоды. У нас наадварот, калі і існуюць яшчэ нейкія абломкі, то толькі дзякуючы нечуванай іх трываласці, бо ў нас усё робіцца, каб іх знішчыць...

За сто гадоў, якія прайшлі пасля напісання гэтых радкоў, наш менталітэт так і не памяняўся!

Вучоны справядліва заўважае, што «для нас мінулае павінна быць падвойна дарагім, бо ў ім адным мы можам чэрпаць натхненне для барацьбы за нацыянальнае існаванне». Далей Шукевіч паказвае, што Лідскаму замку не пашанцавала яшчэ болей, чым іншым. Бо «вельмі мала тут чаго засталося, а тое, што ёсць, падлягае сістэматычнаму руйнаванню не толькі

хцівымі на такі адборны матэрыял, як каменне з муру, жыхароў слаўнага града, але і нязванымі апекунамі, якія як бы задаліся мэтай знішчыць усялякія рысы ўласцівай такім помнікам прыгажосці і замяніць яе на нічога не вартыя сцены з камення».

Шукевіч апісвае працэс паступовага разбурэння замка, які ідзе ў яго на вачах на працягу некалькіх дзесяцігодзяў:

> ...гавораць, што некаторыя з паноў-спраўнікаў лідскіх, пранікшыся трывогай за цэласць лбоў davеraных яго апецы жыхароў слаўнага града Ліды, прыказаў значную частку муру разабраць па кругу, што і было зроблена з вывазам камення на брукаванне вуліц, а цэглы, праўдападобна, на пабудову яўрэйскіх печаў.



*Дом Вандаліна Шукевіча у маёнтку Нача.*
*Здымак з газеты, верагодна, 1920-я гады*

Адмоўна ацэньвае археолаг і першую рэканструкцыю:

> У цэлым можна сказаць, што ў спусташэнні замка больш вінаваты людзі, чым разбуральны час. Спрыялі руйнаванню не толькі нядобрасумленныя людзі, але нават і асобы з самымі лепшымі намерамі... Пасля «ўпарадкавання» па загаду аднаго з «спраўнікаў», нібыта ў імя грамадскай бяспекі... адбылося частковае разбурэнне сцен, асабліва на поўнач і захад... Праз дрэнную руплівасць замуравалі нават арачныя байніцы, размешчаныя ў паўночнай сцяне... муры былі пакрыты зверху цэментам. Ці можа быць гэтая ідэя названа шчаслівай — трэба судзіць спецыялістам. Я думаў, што так праводзіць працы па кансервацыі замка нельга. Можна нават дараваць той факт, што такім чынам былі знявечаныя сцены, але самае горшае, што гэтая цэментная нашлёпка на сценах не прадухіляе пранікненне вільгаці ў сцены, а наадварот, прадухіляе выпарэнне вільгаці, што паскарае працэс разбурэння. Гэта ужо бачна... нідзе так не захоўваюць сцены («Зямля», 18 лістапада 1911, № 46).

Пасля рэвалюцыі 1905—06 гг. і так званага «Кастрычніцкага маніфеста», г.зн. практычна канстытуцыі Расейскай імперыі, зняліся асноўныя перашкоды, якія раней не давалі развівацца грамадскай супольнасці. Вельмі папулярнай ідэяй сярод грамадскасці ў Беларусі стала ідэя так званай «краёвасці». Сутнасць ідэалогіі «краёвасці» заключалася ў тым, што ўсе, хто адчувае сябе «грамадзянамі Краю», належаць да адзінай супольнасці незалежна ад этнічнага паходжання, канфесійнай прыналежнасці і ўжыванай мовы.

Аднак прыхільнікі гэтай ідэі — «краёўцы» не выпрацавалі адзінай ідэалогіі і часта мелі розныя по-

гляды на будучыню свайго краю. Адны з іх разумелі краёвасць не як суіснаванне розных этнасаў-нацыяў, а як утварэнне новай адзінай палітычнай нацыі на падставе «краёвай згоды», другія разумелі краёвасць як добрасуседскае суіснаванне літоўцаў, беларусаў і палякаў. Цяжка сказаць, ці меў Шукевіч дакладна сфарміраваныя перакананні ў гэтым пытанні, але можна з упэўненасцю цвердзіць, што ён быў вялікім патрыётам гістарычнага ВКЛ і з сімпатыяй адносіўся да беларускага руху, які нараджаўся менавіта ў той час у яго на вачах.

Новымі формамі грамадскага руху пасля 1906 г. сталі легальныя грамадска-культурныя арганізацыі. У верасні 1906 г. віленскі губернатар зацвердзіў статут музычнага таварыства «Лютня». Сярод яго заснавальнікаў быў Іосіф Мантвіл — адзін з галоўных фундатараў культурных праектаў. Пачало дзейнічаць культурна-асветніцкага таварыства «Асвета». Адначасова ў Вільні было створана легальнае Таварыства сяброў навук. Старшынёю яго быў абраны ксёндз Ю. Курчэўскі, намеснікам — навукоўцы Уладыслаў Захорскі і Станіслаў Касцялкоўскі. Сярод яго заснавальнікаў былі Эліза Ажэшка, Іосіф Мантвіл, граф Уладыслаў Тышкевіч, граф Ваўжынец Путкамер (сусед Шукевіча, уладальнік маёнтка Бальцэнікі, унук Марылі з Верашчакаў, «адзінай музы Міцкевіча», дэпутат Дзяржаўнай Думы),



*Тэадор Нарбут*

Вандалін Шукевіч і іншыя. Таварыства ўзяло на сябе апеку над кансервацыяй Трокскага замка, але Шукевіч перадаў свае абавязкі Іосіфу Ядкоўскаму, які быў прызначаны Імператарскім Археалагічным таварыствам, афіцыйным кансерватарам помнікаў даўніны ў так званых губернях Паўночна-Заходняга краю. У 1913—14 гг. Ядкоўскі працягваў рамонтныя работы і праводзіў археалагічныя даследаванні Трокскага замка.

Таварыства сяброў навук стварала свой музей і Шукевічу было даручана ім апекавацца. Асноўнымі музейнымі экспанатамі сталі асабістыя калекцыі членаў таварыства, у тым ліку і археалагічная калекцыя самаго Шукевіча. Пад будынак музея граф Іосіф Пшаздзецкі аддаў свой палац.

Але ўжо ў 1910 г., на грамадскія ахвяраванні, пачалі будаваць адмысловы будынак, у якім павінны былі размясціцца музей і ўправа таварыства. Незадоўга да вайны, у 1914 г., будоўля закончылася, і экспанаты музея былі перанесеныя ў новыя пакоі. Для новых экспазіцый Шукевіч заказваў вітрыны, займаўся абсталяваннямі сховішчаў, рабіў выставы. Вельмі часта ён сам праводзіў экскурсіі па музеі.



*Прафесар Юльян Талька-Грынцэвіч*

Жывучы ў Вільні, Шукевіч займаўся не толькі навукай і захаваннем гістарычных помнікаў, але і журналістыкай, якая, дарэчы, давала навукоўцу сталы прыбытак. Ён пісаў ар-

тыкулы і нарысы ў газеты «Літоўскі кур'ер» («Kurier Litewski»), «Віленскі курьер» («Kurier Wilenski»), «Віленскі пасланец» («Goniec Wileński»), «Віленская штодзённая газета» («Dziennik Wileński»). Публікаваў артыкулы па археалогіі ў варшаўскіх газетах.

Аўтар адмыслова вывучаў публікацыі Шукевіча таго часу ў «Літоўскім кур'еры», датычныя Лідскага рэгіёну. Упершыню газета з назвай «Літоўскі кур'ер» з'явілася ў Вільні ў 1759 г., выдавалася ў сярэдзіне XIX ст. і была зачынена расейскімі ўладамі. «Літоўскі кур'ер» быў адноўлены пасля рэвалюцыі 1905 г. пры ўдзеле Элізы Ажэшкі. Першым фактычным рэдактарам адноўленай газеты стаў вядомы публіцыст і землеўласнік Іпаліт Корвін-Мілеўскі, кола аўтараў газеты ў значнай ступені складалася з членаў Віленскага Таварыства сяброў навук.

Па публікацыях Шукевіча можна прасачыць абставіны дастаткова сурьёзных закалотаў у Радунскім і Нацкім рыма-каталіцкіх парафіях у сувязі з падзелам парафіянаў на «палякаў» і «летувісаў». Пісаў вучоны пра этнаграфію і старажытную гісторыю Літвы, кліматычныя змены апошняга часу, дзейнасць землеробчых аб'яданняў і г. д. Не цураўся і чыста журналісцкай працы і нават у такіх паўсядзённых артыкулах ён, адукаваны і дасведчаны чалавек, рабіў цікавыя абагульненні і вывады. Напрыклад, артыкул пра чарговую сесію Віленскага выязнога акруговага суда ў Лідзе пачынаўся так:

> Разгледжаныя справы не былі складанымі. У Лідзе, у адрозненне ад вялікіх гарадоў, няма крадзяжоў, для расследавання якіх патрэбны Шэрлак Холмс, няма заблытаных забойстваў. Злачынствы здзяйсняюцца ў асноўным простымі людзьмі, сякерай або калом. Народная цемра падлівае алей

у лямпу злачыннасці, агонь якой ўсё ж час ад часу абпальвае. Бягучая кадэнцыя суда разгледзела 15 спраў, улічваючы, што акруговы суд збіраецца ў Лідзе 4 разы ў год, не цяжка падлічыць сярэднюю колькасць злачынстваў — 60 у год. А як у лідскім павеце жыве амаль 200.000 чалавек, дык злачыннасць у нас невысокая. Тут, вядома, трэба ўлічыць, што частка спраў не даходзіць да суда прысяжных і г. д. («Літоўскі кур'ер», 1911, № 221).

Але самым цікавым для мяне быў артыкул земляка ў падтрымку беларускай мовы і адукацыі:

Пытанні так зв. нацыянальныя, а як у нас: літоўскае і беларускае, якія падымаюцца на старонках газет, выстаўляюцца ў такіх рознаколерных і адвольных асвятленнях і разглядаюцца найчасцей не праз прызму навуковай нейтральнасці, а праз павялічальнае шкло разнародных пачуццяў... Звычайна, гаворачы аб гэтых пытаннях, мы распальваемся, не можам утрымаць абавязковай у такіх выпадках раўнавагі. Некаторыя «нават выходзяць з сябе» з абурэння ад смеласці «нейкіх там» беларусаў або летувісаў пачуваць у сабе нацыянальную адметнасць. Альбо наогул ігнаруюць справу, прымаюць у такім выпадку тон іранічна-з'едлівы, стараючыся высмеяць кожны рух, скіраваны на ажыццяўленне мараў аб самастойнасці.

Наколькі такая методыка паводзінаў правільная — не будзем на тым спыняцца... Не спрычыніцца яна для раз'яснення сітуацыі і ўладкавання стасункаў паміж бакамі, Наадварот, можа толькі падрыхтаваць грунт пад пасеў непаразуменняў і ўзаемнай непрыязні.

Далей вучоны піша, што пытанні будычыні цэлых народаў не могуць вырашацца ірoніяй, падтасоўкай фактаў ці фразеалогіяй узроўню сярэднявечнай схаластыкі. Такія пытанні павінны асноўвацца на грунтоўных навуковых дадзеных. Бо

> ...народ, які абуджаецца да жыцця адасобленага, альбо мае столькі сілаў жыццёвых, што яго ніякія намаганні свету з дарогі не звернуць, альбо іх не мае...
>
> Народ, які абуджаецца да супольнага жыцця па ўласнай мадэлі, не патрабуе нянек... не прымае ніякага націску і насуперак усяму выквітнее ён з часам цудоўнай кветкай цывілізацыі, уносячы новы элемент у духоўны даробак гэтай цывілізацыі. Наш святы абавязак ёсць — не перашкаджаць у развіцці той кветкі, але дапамагаць ёй.



*Прафесар А. А. Спіцын у 1880-х гадах*

Шукевіч напамінае, што ўсім тутэйшым добра знаёмы прымус да адмовы ад сваёй індэнтычнасці, які заўжды прыводзіць да адваротных вынікаў, бо «народы незнішчальныя ...можна часова прыпыніць іхняе развіццё, але ніколі не ўдасца перамяніць істоту іх духу, забіць любоў да рэчаў айчынных, зацерці рысы адметнасці». Таму «не трэба баяцца таго, што ў нас беларусы горнуцца да кніжак, якія

даюць ім крошкі ведаў у іх роднай мове... да тых, хто ім дапамагае падняцца духоўна ў іх уласнай мове, захаваюць яны пачуццё ўдзячнасці назаўсёды, і яны будуць ненавідзець кожнага, хто стане на шляху іх памкненняў або будзе выказваць непавагу да... нацыянальнасці і мовы».

Шукевіч разумее, што калі краёвая інтэлігенцыя не падтрымае беларускага руху, як ён піша «таго сімпатычнага... руху», дык яго падтрымаюць іншыя сілы і «прынамсі, усходняя група праваслаўных беларусаў будзе цалкам страчана... бо прыхіліцца да крэўнай сабе мовы і веры Вялікаросіі» і таму «нельга забываць пра братоў беларусаў з крыві і косці, якія насуперак усяму самаўсведамляюцца і хочуць захаваць сваю нацыянальную адметнасць».

Такі разумны, інтэлігентны і празорлівы чалавек выклікае вялікую павагу да сябе.

## ФАЛЬКЛАРЫСТ І ЭТНОГРАФ

Усё жыцце Шукевіча вельмі цікавіў народны фальклор. Ён апублікаваў некалькі дзесяткаў прац пра фальклор Лідчыны. Шмат гадоў даследчык збіраў і апрацоўваў этнаграфічны матэрыял, шмат цікавага ўзяў з нататкаў свайго настаўніка і сябра сям'і Уладзіслава Абакановіча. Дарэчы, народныя легенды і паданні таксама збірала і запісвала яго дачка Ванда Аліна.

Сабраную этнаграфічную інфармацыю даследчык падзяліў на сем частак па ўзросце чалавека: ад нараджэння да смерці і апублікаваў у часопісе «Вісла» пад назвай «Вераванні і народная практыка». Падобны матэрыял быў апублікаваны ў «Літоўскім квартальніку» (т. II, 1910 г.). пад назвай «Некаторыя вераванні, прымхі і забабоны нашага народу. Легенды і паданні».

У гэтым артыкуле змешчана 432 запісы, 15 легенд, паданняў, у якіх расказваецца пра каралеву Бону, пра ваенныя дзеянні з татарамі, шведамі, французамі і інш., 159 вераванняў і прымхаў.

Усе вераванні і прымхі Шукевіч разбіў на 6 груп:

1) спосабы хутчэйшага замужжа (жаніцьбы);

2) паводзіны ў замужжы, адносіны да цяжарнасці, да немаўлят;

3) сакрэты, якія забяспечваюць поспех у жыцці і гаспадарцы, спосабы барацьбы з сурочаннем;

4) спосабы шкодзіць іншым і розныя заклінанні;

5) варажба і прадказанні;

6) лячэнні і замовы.

Этнограф прыходзіць да высновы, што трывалая вера ў таямнічыя звышнатуральныя сілы захоўваецца ў народзе, дзякуючы яго глыбокай рэлігійнасці. Шукевіч адзначае, што забабоны часам даходзяць да абсурду. Перажыткі былі настолькі трывалымі, што калі б не юрыдычныя нормы і не страх пакарання з боку дзяржаўных улад, то простыя людзі карысталіся б у жыцці звычаёвым сярэдневяковым правам дзеля расправы з «чараўнікамі», людзьмі, якія могуць «сурочыць». Этнограф падкрэсліваў, што ў народзе створаны цэлы кодэкс паводзін, прыдатны на ўсе выпадкі жыцця, які складаецца з розных перасцярог, абмежаванняў, забарон і г. д.

Яшчэ адна прычына трываласці перажытачных з'яў — гэта канкрэтныя гістарычныя ўмовы развіцця беларусаў, калі тыя былі ў прыніжаным становішчы. Шукевіч пісаў, што нельга заплюшчваць вочы на зло, якое творыцца на Беларусі:

> Сяляне былі нашымі братамі па крыві і целу, яны першапачаткова былі такімі ж вольнымі, як і мы, і якіх мы, выкарыстоўваючы слабасць каралёў,

пастановамі соймаў спіхвалі ўсё ніжэй, і нарэшце, кіруючыся сваім эгаізмам, насуперак агульным інтарэсам, зрабілі іх амаль што нявольнікамі...

Разважаючы над народным менталітэтам, В. Шукевіч у тым жа артыкуле запісаў сумнае назіранне:

> ...люд наш ніякіх фактаў з гісторыі свайго краю, нават найвыключных, зусім не захаваў у памяці. Верагодна, яго нічога не цікавіла, хоць бы самыя гвалтоўныя пераваротьі, а буры, якія так часта скаланалі нашу айчыну, абыходзілі яго «бокам», не пакідаючы ў памяці глыбокіх слядоў.

Артыкул Вандаліна Шукевіча «Старажытныя лекавыя сродкі», надрукаваны ў V томе «Літоўскага квартальніка», прысвечаны народнай медыцыне. У аснову яго ляглі матэрыялы, атрыманыя даследчыкам ад свайго дзеда Мацея Волк-Карачэўскага. Згодна запісу, зробленаму самім дзедам, усе прыведзеныя спосабы лячэння адносяцца да XVIII ст. Навуковец зрабіў агульны аналіз матэрыялаў і вылучыў сярод спосабаў лячэння тыя, якія заключаліся ў выкананні пэўных дзеянняў, і тыя, якія былі звязаны з выкарыстаннем рэчавых сродкаў расліннага і жывёльнага паходжання. Да 1-й групы ён ставіўся вельмі скептычна, затое лічыў, што веданне прыродных лекаў можа быць вельмі карысна.

У артыкуле згадваецца 32 спосабы лячэння з дапамогай сродкаў расліннага і жывёльнага паходжання, прыводзяцца рэцэпты выкарыстання жывёльнага тлушчу, сала, мяса, асобных органаў жывёл, малака. Усе гэтыя рэчывы браліся ў свіней, мядзведзяў, зуброў, зайцоў, вожыкаў і іншых хатніх і лясных жывёл. Розныя захворванні лячыліся рознымі метадамі, нават калі выкарыстоўвалі адны і тыя ж сродкі (тлушч,

малако і інш.). Гэта сведчыць аб разуменні лекарамі living рознабаковага ўздзеяння гэтых сродкаў. Яшчэ ў гэтай працы гаворыцца пра тое, што жывёльныя рэчывы выкарыстоўваліся для таго, каб ад здаровай жывёлы перадаць моц хвораму чалавеку.

У часопісе «Зямля» Шукевіч змясціў апісанне народных звычаяў, звязаных з выпечкай хлеба. Артыкул падрабязна апісваў посуд для розных этапаў выпечкі, падрыхтоўку збожжа да памолу, прыгатаванне і захоўванне рошчыны, замес і выпечка хлеба.

Аўтар адзначыў, што нашы людзі заўжды цанілі хлеб, бо

> ...у разуменні чалавека хлеб — гэта важнейшая аснова яго ежы ...дадзены Богам, ёсць божым падарункам, таму годны не толькі павагі, але і шанавання. У адпаведнасці з гэтымі паняццямі абыходзяцца з хлебам і са збожжам, з якога пякуць хлеб, вельмі асцярожна. Як быццам бы баяцца, каб неадпаведнымі паводзінамі не разгневаць Пана Бога.



*Ліда на пачатку XX ст.*

Цікавейшы артыкул пра выраб пісанак і велікодныя забавы з імі Шукевіч надрукаваў у часопісе «Зямля» (Р. IV, 1913 г., № 19).

У наваколлях Начы даследчык збіраў маскі, якія выкарыстоўвалі народныя калектывы пры пастаноўцы батлейкі «Кароль Ірад», а таксама збіраў народныя музычныя інструменты. Пры раскопках Шукевіч знайшоў некалькі каменных сякер, якія мясцовыя сяляне называлі «стрэламі Перуна». Вучоны запісаў легенду, з якой вынікала, што гэтыя стрэлы кідае ўніз Пярун пры моцнай навальніцы раз у 12 год. Сяляне лічылі сякеры чароўнымі, здольнымі лекаваць хваробы. Знаходзілі такія сякеры даволі часта, жыхары драбнілі іх, крышылі і ўжывалі парашок пры хваробах страўніка, давалі каровам. Гаспадыні нават замешвалі парашок у цеста, каб хлеб выпякаўся смачней. Усяго ім было зроблена больш за 400 запісаў фальклору. Збор дапаўняецца 15 легендамі, паданнямі і 159 вераваннямі.

* * *

Свае археалагічныя і этнаграфічныя калекцыі Вандалін Шукевіч захоўваў у сваім маёнтку ў Начы, потым перадаў у музей Таварыства сяброў навук у Вільні, таксама ў зборы Эразма Маеўскага ў Варшаве і ў Этнаграфічны музей у Кракаве. Віленскія зборы падчас войнаў, рэвалюцый і змен уладаў былі амаль поўнасцю знішчаны і разрабаваны. Затое ў Кракаве, на шчасце, калекцыі Шукевіча захаваліся. Калекцыі Шукевіча зараз захоўваюць музеі Вільні, Кракава і Масквы. Дарэчы, яшчэ пры канцы XIX ст. прафесар Э. Вальтэр напісаў кнігу з апісаннямі самых цікавых прыватных калекцый вядомых даследчыкаў нашага краю, і сярод іншых кніга змяшчае апісанне калекцыі В. Шукевіча (Вольтер Археологические коллекции частных лиц в Северо-Западном крае. Вильна, 1889).

Мірнае жыццё перапыніла Першая сусветная вайна. Помнікі даўніны з музея былі вывезены ў Маскву і Пецярбург і шматлікіе экспанаты калекцыі зніклі.

* * *

Усяго вучоны адкрыў больш за 130 помнікаў каменнага веку, правёў раскопкі грунтавых і курганных могільнікаў каля вёсак Нача, Пузелі, Вензаўшчына, Дварчаны, Апаноўцы, Сырні, Чэрнішкі, Ланкішкі, Плітніца і інш. Даследаваў 16 курганоў і 396 пахаванняў тыпу жальнікаў XIII—XIV стст. Імкнуўся прасачыць эвалюцыю абраду пахаванняў ад неаліту да часоў Вялікага княства Літоўскага, першым з беларускіх археолагаў стаў праводзіць хімічныя аналізы знаходак.

Шукевіча высока ацэньвалі гісторыкі першай паловы XX ст.



*Адна з залаў Віленскага музея старажытнасцяў у сярэдзіне XIX ст.*
*(З альбома мастака Яна Вільчынскага)*

Напрыклад, вядомы гісторык Юльян Талька-Грынцэвіч у сваіх успамінах напісаў пра Шукевіча:

...Вандалін Шукевіч, які ўжо не жыве, археалагічныя зборы якога аздабляюць музей Таварыства сяброў навукі ў Вільні. Гэты сціплы, без прэтэнзій чалавек... быў найлепшым знаўцам перадгісторыі малога памежнага пояса Лідскага павета, беларускіх і літоўскіх магіл, у помніках якіх даскана́ла, па-майстэрску арыентаваўся... Чалавек вель-



*Палац графа Іосіфа Пшаздзецкага аддадзены пад музей*

мі інтэлігентны, як, зрэшты, і ўсе Шукевічы, адрозніваўся любоўю да мастацтва і патрыятызмам. Многія з іх плацілі бацькаўшчыне ўласнай крывёю, змагаючыся ў паўстаннях і ідучы ў эміграцыю.

Вандалін быў годным сынам гэтага роду, меў рыцарскі характар і любоў да зямлі, на якой ён вырас. У маладосці браўся за пяро, пісаў вершы, актыўна ўдзельнічаў у грамадскіх справах, у ахове помнікаў краю, а потым яго захапілі справы, якія былі звязаны са старажытнай гісторыяй кутка, у якім пражыў усё сваё жыццё... Не ведаю, ці быў... другі такі чалавек, які так выдатна, як ён, ведаў гэты лапік лідскай зямлі ...так падрабязна даследаваў і апісаў... (Талька-Грынцэвіч, «Успаміны з апошніх гадоў», 1932 г.).

Аб каштоўнасці яго археалагічнай працы напісаў:

Самааддана аручы цалінную глебу, стаў адзіным прадаўжальнікам работы па старажытнай гісторыі Літвы, распачатай калісьці Віленскай археалагічнай камісіяй. І той, хто захоча працягваць гэтыя даследаванні, будзе заўжды вымушаны абапірацца на матэрыялы, сабраныя ім (Талька-Грынцэвіч, «Археалагічныя паведамленні», 1920 г., т. V).

Даследчыцкую дзейнасць Вандаліна ў расійскім археалагічным асяроддзі папулярызаваў Аляксандр Спіцын. У артыкуле, які быў змешчаны ў часопісе «Известия археологической комиссии», напісаў:

Дасягненні Шукевіча растлумачыць можна не толькі багаццем гістарычных помнікаў у ваколіцах яго дзейнасці, але перш за ўсё сістэматычнасцю яго пошукаў (А. Спіцын, «Раскопкі В. Шукевіча, 1909 г., с. 68).

Але не забыты ягоны ўклад у навуку і праз шмат гадоў. У 1962 г. выбітны ленінградскі археолаг Ф. Д. Гурэвіч у сваёй фундаментальнай працы «Древности белорусского Понеманья» падсумавала вынікі даследаванняў Шукевіча. Яна высока ацаніла дзейнасць нашага земляка:

> Хоць В. Шукевіч сціпла называў сябе дылетантам, яго справаздачы, дасланыя ў Археалагічную камісію (у Пецярбург. — *Л. Л.*), і яго публікацыі, пераважна ў польскай археалагічнай літаратуры, сведчаць пра высокія для таго часу прафесійныя навыкі.

Аўтарытэтны беларускі археолаг Я. Г. Зверуга ў сваёй выніковай кнізе «Верхнее Понеманье в IX—XIII вв., 1989) піша, што па-ранейшаму галоўнай крыніцай вывучэння каменных магіл з'яўляюцца матэрыялы раскопак В. А. Шукевіча і Э. А. Вальтэра, якія даследвалі «ў канцы XIX — пачатку XX ст. у межах былога Лідскага павета больш за 400 магіл: толькі ва ўрочышчы Ланкішкі каля Начы В. А. Шукевічам перад Першай сусветнай вайной раскапана 170 пахаванняў».

Сучасныя археолагі падкрэсліваюць, што ім былі выяўлены стаянкі амаль усіх эпох старажытнай гісторыі і ранняга сярэднявечча. Археолаг першым адкрыў у Беларусі стаянкі з артэфактамі, якія адносяцца да сярэдняй эпохі каменнага веку (мезаліту), дзе сабраў шматлікія прылады, зробленыя з крэмня (Шукевіч, «Каменная эпоха ў Віленскай губерні», «Святавід», 1901, Т. 3). Ён таксама адкрыў самыя старыя неалітычная пахаванні ў беларускай частцы ўзбярэжжа Нёмана ва ўрочышчы Ланкішкі, даследаваўшы іх у 1911, 1913 і 1914 гг. На пляцы 3600 кв. метраў ім было вывучана больш за 80 пахаванняў,

у большасці з іх целы былі спаленыя. У пахаваннях знаходзіліся каменныя вырабы і аскепкі посуду, упрыгожаныя арнаментам.

З яго імем злучаны даследаванні пахаванняў эпохі латэна ў Начы, Рудне, Зубішках, Чапялюнах і інш.

Вельмі цікавы могільнік ва ўрочышчы Ланкішкі ў Наче, які В. Шукевіч залічыў у разрад неалітычных.

Ён раскапаў шэраг курганоў рымскага часу (Версока, Вільканцы і інш.), якія з'яўляюцца тыповымі балцкімі помнікамі. У 1911 г. у Начы В. Шукевіч адкрыў грунтовы могільнік другой паловы I тысячагоддзя н.э.

Шмат увагі надаў ён даследаванню каменных магіл тыпу жальнікаў XIII—XIV стст. Гэта своеасаблівая група помнікаў была невядомая да яго прац.

* * *

Улетку 2010 г. аўтар гэтай кнігі з вялікай цікавасцю аб'ехаў, знайшоў, агледзеў і зафатаграфаваў частку археалагічных помнікаў, адкрытых яго земляком Вандалінам Шукевічам.

## ЛІТАРАТУРА

1. Blombergowa M. M. Wandalin Szukiewicz (1852 — 1919) // Warszawa — Lida, 2010.

2. Brensztejn M. Wandalin Szukiewicz. // Ziemia. Tygodnik Krajoznawczy Ilustrowany.1914, № 15.

3. Wandalin Szukiewicz. Z żałobnej karty // Ziemia. Miesięcznik krajoznawczy illustrowany. Warszawa, 1920, № 1.

4. Gajewski M. Szukiewicz Wandalin (1852—1919). Wandalin Szukiewicz — badacz przeszłości Wileńszczyzny // «Nasz Czas», 2001, № 6 (539).

5. Talko-Hryncewicz J. Wandalin Szukiewicz jako prehistoryk Litwy. WA, T. V, zesz. 1—2, 1920, s. 65—70.

6. Grzymala-Przybytko A. Wandalin Szukiewicz // «Ziemia Lidzka», 1936, № 3.

7. Śnieżko. Uczcijmy pamięć Wandalina Szukiewicza // «Ziemia Lidzka», 1939, № 3.

8. Śnieżko A. Wspomnienie o Józefie Joczowej // «Ziemia Lidzka», 1939, № 6.

9. Śnieżko A. Rzeź niemiecka w Naczy // «Ziemia Lidzka», 1939, № 8.

10. Спицын А. А. Предполагаемые древности Червоной Руси. Записки Императорского Русского Археологического общества. Кн. 4., 1899. Т. XI, с. 303—310.

11. Спицын А. А. Раскопки В. Шукевича // Известия Археологической комиссии. СПб., 1909. Вып. 29, с. 68—70.

12. Спицын А. А. Могильники с каменными кистами в Виленской губернии // Известия Археологической комиссии. СПб., 1904. Вып. 12, с. 26—29.

13. Гуревич Ф. Г., Древности белорусского Понеманья. Ленинград, 1962, с. 8—9, 128—129.

14. Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв. Минск, 1989, с. 87—92.

15. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 — люты 1917 г. СПб., 2004.

16. Археалогія і нумізматыка Беларусі, Мн., БелЭн, 1993, с. 661.

17. Суднік С. Этнаграфічнае вывучэнне Лідчыны ў XIX—XX стагоддзях // «Лідскі летапісец», 2002, № 2 (14), с. 31—35.

18. Суднік С. Вандалін Шукевіч: 160 гадоў з дня нараджэння // «Лідскі летапісец», 2012, № 4 (60), с. 7.

19. Лаўрэш Л. Касцёл у Начы // «Наша слова», № 14 (1061), 4 красавіка 2012 г.

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........................................ 3
Біяграфія даследчыка ........................................ 6
Навуковая дзейнасць ........................................ 25
Грамадская дзейнасць ........................................ 41
Фальклярыст і этнограф ........................................ 52
Літаратура ........................................ 62

Навукова-папулярнае выданне

**ЛАЎРЭШ Леанід**

**ВАНДАЛІН ШУКЕВІЧ**

**БЕЛАРУСКІ АРХЕОЛАГ І КРАЯЗНАЎЦА**

Ответственный за выпуск *Ю. Г. Хацкевич*

Подписано в печать 28.04.2014.
Формат 70 × 90 $^1/_{32}$. Бумага офсетная. Печать офсетная.
Усл. печ. л. 2,34. Уч.-изд. л. 2,2.
Тираж 1500 экз. Заказ 1229.

ООО «Харвест». Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/17 от 16.08.2013.
Ул. Кульман, д. 1, корп. 3, эт. 4, к. 42, 220013, г. Минск, Республика Беларусь.
E-mail редакции: harvest@anitex.by

Республиканское унитарное предприятие
«Издательство «Белорусский Дом печати».
Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/102 от 01.04.2014 г.
Пр. Независимости, 79, 220013, г. Минск, Республика Беларусь.



ISBN 978-985-18-2912-1
9 789851 829121

Вандалін Шукевіч (1852—1919) – славуты беларускі археолаг, краязнаўца, этнограф і фалькларыст. З 1883 г. праводзіў археалагічныя даследванні ў паўночна-заходняй Беларусі. Сабраў багатую археалагаічную калекцыю, якая захавалася у розных музеях. Запісаў шмат легенд і паданняў пра помнікі даўніны. Аўтар мноства навуковых артыкулаў.